# У МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ КААПЭРАЦЫІ—ЯШЧЭ ВЫШЭЙ БАЯВЫ СЬЦЯГ КАМУНІЗМУ!

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
4 ліпеня 1931 г.
№ 151 (3240)

## Вышэй сьцяг міжнароднай пралетарскай салідарнасьці

(Да міжнароднага дню каапэрацыі)

Каапэрацыя ў СССР адна з форм ўцягненьня мільёнаў працоўных у рады актыўных будаўнікоў сацыялізму, школа калектыўнай сацыялістычнай будоўлі, магутная зброя нашае партыі ў барацьбе за сацыялізм. Побач з шпаркімі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і вёсцы расьце і мацнее наша каапэрацыя. Нясупынна пашыраецца сётка каапэрацыйных ганд-лёвых крам, паляпшаецца абслугоўваньне спажыўца. Нясупынна павялічваецца лік пайнікаў, якіх на сёньняшні дзень налічваецца звыш 60 мільёнаў. Партыя і ўрад ўсю работу каапэрацыі прыстасоўваюць да найхутчэйшага палепшаньня забесьпячэньня рабочае клясы, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас, да хутчэйшага палепшаньня грамадзкага харчаваньня, палепшаньня дабрабыту працоўных мас.

Рабочая каапэрацыя ў капіталістычных краінах нясе цяжар ня толькі ад глыбокага сусьветнага эканамічнага крызісу капіталізму, ня толькі ад канкурэнцыі трэстаў і сындыкатаў, ад ліхвяроў - банкіраў, а яна церпіць ад нясупыннага тэрору буржуазных урадаў. Рабочая каапэрацыя ў буржуазных краінах зьяўляецца дапаможнай арганізацыяй у барацьбе пралетарыяту з эксплёататарамі—жывадзёрамі. Вось чаму ўся буржуазная машына, увесь апарат прыгнечаньня з такой сілай па даўляе каапэрацыйны рух. Супроць рабочай каапэрацыі, якая ня ідзе на паслугі буржуазіі, пушчаны ў ход паліцэйскі апарат, пушчаны ў ход лёкаі-прыслужнікі капіталізму—сацыял-інтэрвэнты.

Буржуазія ўсімі сіламі і спосабамі імкнецца падначаліць сабе каапэрацыйны рух. І для гэтай мэты яна пасылае сваіх агентаў сацыял-фашыстаў, якія надрываюць рабочую каапэрацыю, ператвараюць у гандлёвае прадпрыемства групкі палітычных спэкулянтаў. Супроць рабочых каапэратараў, якія не паддаюцца, не прадаюцца буржуазіі, якія каапэрацыю лічаць адной з пралетарскіх арганізацый у барацьбе з буржуазным ладам, супроць такіх сапраўдных рэвалюцыянэраў буржуазныя ўрады прымаюць самыя жорсткія рэпрэсыўныя меры, самы суровы тэрор.

Капіталісты добра ведаюць, што каапэрацыя, калі яна знаходзіцца ў руках пралетарыяту, калі каапэрацыйным рухам кіруе авангард пралетарыяту—камуністычная партыя, каапэрацыя зьяўляецца магутнейшай зброяй пралетарыяту ў барацьбе з буржуазіяй: У гэтым капіталісты пераканаліся ў часе клясавых баёў—забастовак. Там, дзе каапэрацыя знаходзілася ў руках авангарду пралетарыяту—кампартыі, бастуючыя атрымлівалі дапамогу, атрымлівалі крэдыт.

Там, дзе каапэрацыя знаходзілася ў руках сацыял-дэмакратаў, гэтых прадажных агентаў, цапных сабак буржуазіі ,там бастуючыя не атрымлівалі ніякага крэдыту, ніякай дапамогі.

Буржуазія дапамагае сацыял-інтэрвэнтам, падтрымлівае іх маральна і матар'яльна з тым, каб яны маглі ўтрымаць жоўтую — каапэрацыю—гэтую «палітычную лавачку» для яшчэ большага закабаленьня, ачмучваньня працоўных мас.

Аднак, ня гледзячы на люты тэрор, на самую жорсткую расправу буржуазіі рабочая каапэрацыя, якой кіруюць адданейшыя барацьбіты за справу пралетарыяту, заваёўвае з кожным днём усё больш і больш аўтарытэт, вырывае пазіцыю за пазіцыяй з рук прадажных агентаў жоўтага інтэрнацыянаду, з рук сацыял-інтэрвэнтаў.

У дзень міжнароднай каапэрацыі рабочая кляса, калгасьнікі, усе працоўныя Савецкага Саюзу яшчэ вышэй узьнімуць сьцяг міжнароднай салідарнасьці, яшчэ гучней раздасца заклік да барацьбы за ператварэньне каапэрацыі ва ўсіх краінах у зброю клясавай барацьбы пралетарыяту са савецкую ўладу, за поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне ўсіх эксплёатуемых і прыгнечаных.

Кожны новы посьпех сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, кожнае наша дасягненьне на фронце індустрыялізацыі, калектывізацыі, лепшая, больш арганізаваная бесперабойная чоткая работа каапэрацыі, як неадрыўнай часткі сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца моцным ўдарам па капіталізму. Трэба яшчэ вышэй узьняць мабілізацыю працоўных мас, усёй пралетарскай грамадзкасьці на яшчэ больш рашучае і неадкладнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб перабудове каапэрацыі. Рашучая барацьба з бюракратызмам, з расхлябанасьцю, з цыганшчынай у каапэрацыйным апараце, ачыстка апарату ад шкоднікаў-расстратчыкаў, зьнішчэньне ўсіх недахопаў — неабходнейшыя ўмовы для перабудовы спажывецкай каапэрацыі тварам да сацыялістычнага будаўніцтва.

Перабудова вытворчай дзейнасьці спажывецкай каапэрацыі зьяўляецца неабходнейшай умовай для выкананьня і перакананьня вытворчых плянаў. Увядзеньне жорсткага гаспадарчага разьліку, зьдзельшчыны і прэміяльнай сыстэмы аплаты працы, палепшыць работу каапэрацыі. Каапэрацыйныя арганізацыі павінны прылажыць усе сілы, каб вызваліць сродкі пралетарскай дзяржавы з каапэрацыйнага звароту на справу індустрыялізацыі краіны. Каапэрацыйныя арганізацыі павінны цьвёрда і рашуча па бальшавіцку правадзіць збор паёў, укладаў і авансаў і мэтавых узносаў на будаўніцтва. Каапэрацыйныя арганізацыі павінны змагацца са штучным наладжваньнем «дэфіцыту», з залежамі тавараў, павінны паскорыць таваразварот, поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку ў таваразвароце, як найхутчэй спросьціць і спэцыялізаваць кіраўніцтва справай забесьпячэньня працоўных.

Каапэрацыйныя арганізацыі і ўся савецкая грамадзкасьць павінны ўдзяліць максымум увагі для лепшага наладжваньня абслугоўваньня шырокіх працоўных мас. На каапэрацыі ляжыць адказнейшая задача забясьпечыць рабочых гароднінай і іншымі прадуктамі. Пралетарская грамадзкасьці павінна ўсямерна ёй дапамагчы ў гэтым. Наша каапэрацыя павінна паленшыць абслугоўваньне нашых верных вартаўнікоў — чырвонаармейцаў, поўнасьцю падпарадкаваць работу каапэрацыі задачам выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну на фабрыках, заводах, саўгасах і калгасах. Ударная работа каапэратараў, цьвёрдае бальшавіцкае кіраўніцтва, рашучая барацьба з правымі і «левымі» апартуністамі—забясьпечыць ажыцьцяўленьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач перад нашай каапэрацыяй.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК наша каапэрацыя пераможа ўсе няжкасьці, перабудуе сваю работу і поплеч з перадавымі заводамі будзе ісьці ў першых радох будаўнікоў сацыялізму. Яшчэ вышэй сьцяг міжнароднай пралетарскай салідарнасьці! За інтэрнацыянальнае выхаваньне! Сацыялістычная каапэрацыя супроць сусьветнага імпэрыялізму, супроць новых войнаў будзе весьці рашучую барацьбу.

Няхай жыве адзінства рэвалюцыйнага каапэрацыйнага руху!

# ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА—У ПЕРШЫЯ РАДЫ барацьбы за ўборачную машыну!

**Дэпутацкая група Гомсельмашу адказвае калгасьнікам калгасу „Чырвонай Рудні" і дэпутацкай групе заводу „Серп и Молот". Дэпутацкія групы—„Чырвонага Мэталіста" і „Чырвонага Адраджэнца", прымеце выклік гомсельмашаўцаў! Уступайце ў сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае выкананьне праграмы выпуску ўборачных машын!**

## Да дэпутацкіх груп Гомсельмашу „Чырвоны Мэталіст" і „Чырвоны Адраджэнец"

**У сваёй адозьве да рабочых і адміністрацыйна тэхнічнага пэрсаналу вашых заводаў, мы калгасьнікі «Чырвоны рудні» Жлобінскага раёну пісалі аб тым, што вашы заводы маюць вялікую запазычанасьць перад дзяржавай ў галіне выпуску бульба-капалак, сіласарэзак, бульбасартовак, саломарэзак, сячкарань ды інш., і што ставіць пад пагрозу своечасовую ўборку некаторых культур з сацыялістычных палёў.**

**Мы лічым ,што вы дэпутацкія групы, разам з трыкутнікам вашых заводаў несяце поўную адказнасьць перад пралетарскай грамадзкасьцю за гэтыганебны прарыў.**

**Мы пытаемся—што вы зрабілі для таго, каб забясьпечыць выкананьне ускладзенай на вас задачы па забясьпячэньні ўборачнымі машынамі? Чаму вы ня прынялі звароту дэпутацкай групы Харкаўскага заводу «Серп і Молат». Гэтая дэпутацкая група,—поўнае выкананьне заданьня па выпуску ўборачных машын паставіла цэнтральнай задачай у сваёй рабоце. Дэпутацкая група заводу «Серп і Молат» мабілізавала сябе і мабілізоўвае ўсіх рабочых і тэхнічных пэрсанал, вызначыўшы сабе рад канкрэтных абавязацельстваў накіраваных на тое, каб выканаць ускладзеныя на іх завод задачы. Чаму вы не пасьледвалі іх прыкладу? Чаму вы не ўключыліся ў барацьбу за хутчэйшую ліквідацыю прарываў? За тое, каб як мага хутчэй змыць з вашых заводаў ганебную пляму і зьняць пагрозу зрыву забясьпячэньня сацыялістычных палёў ўборачнымі машынамі?**

**Дэпутацкія групы заводаў Гомсельмашу,«Чырвоны Мэталіст» і «Чырвоны Адражэнец», сумесна з партарганізацыяй, фабзаўкомам і адміністрацыяй неадкладна ўключэцеся ў барацьбу за ліквідацыю прарываў, вызначаўшы канкрэтныя мерапрыемствы, станавіцеся ў першых радох барацьбы за арганізацыю рабочых і тэхнічнага пэрсаналу вашых заводаў. Трэба забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў і хутчэйшую ліквідацыю вашай запазычанасьці перад нашай пралетарскай дзяржавай.**

**Дэпутацкія групы ко павінны стаяць у баку ад выканань' адказнейшай задачы ў справе забясьпячэньня машынамі ўборачнай кампаніі.**

**Калгасьнікі калгасу «Чырвоная рудня» Сакачоў (сакратар партячэйкі), Кароткі (старшыня сельсавету), Марошын (старшыня калгасу), Немцаў, Капусьцін, Савасьцянаў, Кавалёў, Старасотнікаў, Худалеў, Смальцоў, Крупеніс і Калбаскін.**

## Слова мае дэпутацкая група Гомсельмашу

Рабочая кляса, абапіраючыся на калгаснае сялянства, у саюзе з бядняцка-серадняцкімі масамі, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі ідзе непераможным крокам ад аднэй перамогі да другой на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Сацыялістычная прамысловасьць расьце і разьвіваецца шпаркім тэмпам. Растуць буйныя новыя пралетарскія цэнтры, узьнікаюць волаты-заводы і фабрыкі. У трэцім рашаючым годзе ў строй уступяць 518 буйнейшых фабрык і заводаў і 1040 МТС, што будзе зьяўляцца чарговай перамогай рабочае клясы ў пабудове сацыялізму.

У выніку шпаркага разгортваньня індустрыялізацыі атрымаліся вялізарнейшыя магчымасьці больш хуткімі тэмпамі праводзіць сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. На фронце перабудовы сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад атрыманы таксама буйнейшыя дасягненьні. Сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі (саўгасы і калгасы) узяў перавагу над аднасобным сэктарам, як па колькасных, так і па якасных паказальніках. Гэта яскрава даводзіцца вынікамі другой калгаснай вясны, калі саўгасы і калгасы перавыканалі пляны сяўбы, калі калгасы па становішчы на 30-VI—1931 году аб'яднаюць 54 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Савецкага Саюзу, 40,1 проц. бедняцка-сераднякіх гаспадарак БССР. Шпаркімі тэмпамі разгортваецца суцэльная калектывізацыя і на яе аснове ліквідацыя кулацтва як клясы.

БССР, як неадлучная частка Савецкага Саюзу, на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, пры дапамозе ўсёй рабочай клясы СССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, атрымала буйнейшыя перамогі на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Беларусь з краіны аграрна-адсталай ператвараецца ў краіну індустрыяльна-калгасную.

Перад рабочай клясай, калгасным сялянствам і ўсімі працоўнымі Савецкага Саюзу зараз стаіць адна галоўнейшая задача—выканаць і перавыканаць баль шавіцкую праграму трэцяга рашаючага году пяцігодкі, году, які зьяўляецца годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне.

Нашаму заводу пастаўлена заданьне—забясьпечыць сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі машынамі, асабліва сіласарэзкамі. Жывёлагадоўля ва ўмовах БССР зьяўляецца вядучай галіной сельскае гаспадаркі. Праблема жывёлагадоўлі залежыць у значнай меры ад таго, наколькі мы пасьпяхова справімся са стварэньнем моцнай кармовай базы. Адным з важнейшых мерапрыемстваў, поўнае ажыцьцяўленьне якога вырашае посьпех у справе стварэньня кармавой базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі, зьяўляецца сіласаваньне кармоў. Даць сіласарэзкі нашым саўгасам і калгасам—гэта значыць дапамагчы ім выканаць баявыя задачы партыі і ўраду ў справе вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

Як-жа наш завод спраўляецца з ускладзенай задачай—вырабам сіласарэзак?

На аснове сустрэчнага прамфінпляну на працягу трэцяга рашаючага году, завод павінен даць 7.800 сіласарэзак. Якасныя і колькасныя паказьнікі за першае паўгодзьдзе кажуць аб тым, што завод з гэтай задачай спраўляецца нездавальняюча. За першую палову 1931 году завод выпусьціў 2.795 сіласарэзак, што складае да гадавой праграмы 35,8 проц. Паўгадовае заданьне, якое было вызначана ў 4.000 штук сіласарэзак, заводам выканана толькі на 70 проц. Такім чынам, завод за першае паўгодзьдзе не дадаў краіне 1.005 сіласарэзак. Да канца году для таго каб ліквідаваць сваю запазычанасьць краіне і выканаць заданьне другога паўгодзьдзя, завод павінен выпусьціць 4.905 штук сіласарэзак.

Перад рабочым калектывам Гомсельмашу стаіць найадказнейшая задача, з выкананьнем якой ён павінен бязумоўна з посьпехам справіцца. **Значная доля работы і адказнасьці ў выкананьні баявога заданьня—даць да канца трэцяга рашаючага году 4.905 сіласарэзак, прыпадае на дэпутацкую групу.** Мы дэпутаты Гомельскага гарсавету ад заводу Гомсельмаш да гэтага часу ня зусім добра змагаліся за выкананьне прамфінпляну, ня зусім добра дапамагалі кіраўніцтву заводу ў мабілізацыі рабочых мас, гаспадарчага і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу на выкананьне баявой праграмы трэцяга рашаючага году.

Мы лічым, што такое становішча працягвацца далей ня можа і ў мэтах узмацненьня нашага ўдзелу ў барацьбе за прамфінпляны ставім перад сабой наступныя задачы:

1. Уступаем усе як адзін у рады ўдарнікаў і арганізуем дапаможную скразную брыгаду, якая павінна прымаць самы найактыўнейшы ўдзел у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну;

2. Будзем змагацца і садзейнічаць абавязковаму выкананьню дзённых заданьняў па выпуску сіласарэзак у колькасьці 30 штук, што павінна да канца году даць 5.400 сіласарэзак;

3. Мы ведаем, што справа ня ў толькі колькасьці, але і ў якасьці. Таму мы ставім сабе задачу—дабіваца поўнага выкананьня плянавых заданьняў па зьніжэньні сабекошту, па ўздыме прадукцыйнасьці працы, палепшаньні якасьці прадукцыі;

4. Аказваць самую непасрэдную дапамогу кіраўніцтву заводу ў барацьбе з прагульшчыкамі, рвачамі, лятунамі і шкоднікамі—гэтымі ворагамі сацыялістычнага будаўніцтва;

5. Гаспадарчы разьлік—цэнтральная задача. Выкананьне гэтай задачы мы ставім ў асродак дзейнасьці дэпутацкай групы. Мы будзем дабіваца сапраўднага пераводу на гаспадарчы разьлік ня толькі цэхаў, але брыгад і груп.

Таварышы! Дэпутаты гарсаветаў заводаў **«Чырвоны Мэталіст»** (Віцебск), **«Чырвоны Адраджэнец»** (Магілеў) ці ведаеце вы аб тым, што перад вамі стаяць таксама найадказнейшыя задачы—забясьпечыць сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі бульбакапалкамі і сіласарэзкамі. Бульбакапалкі павінен даць **«Чырвоны Мэталіст»**, а сіласарэзкі — **«Чырвоны Адраджэнец»**. Мы зараз ня маем магчымасьці судзіць аб вашай рабоце па ўдзеле ў выкананьні плянавых заданьняў па вырабе бульбакапалак і сіласарэзак і таму просім на старонках газэты **«САВЕЦКА БЕЛАРУСЬ»** падзяліцца сваім вопытам па ўдзеле ў выкананьні праграмы трэцяга рашаючага.

**Мы выклікаем вас на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшы ўдзел у выкананьні праграмы трэцяга рашаючага, асабліва па такіх сельска-гаспадарчых машынах як сіласарэзкі і бульбакапалкі.**

**Пасьля таго, як будуць зьмешчаны вашы адказы на наш заклік на старонках газэты «Савецкая Беларусь», наша спаборніцтва з вамі набывае моц.**

Тэрмін сацспаборніцтва мы прапануем устанавіць 15-га ліпеня 1931 г. па 1-студзеня 1932 году.

Кантроль і праверку ўзятых на сябе абавязацельстваў даручаем: **па Гомсельмашу—«Палескай Праўдзе», па «Чырвонаму Мэталісту»—«Віцебскаму Пралетару», па «Чырвонаму Адраджэнцу»—«Камунару Магілеўшчыны».**

**У якасьці агульнага арбітра, прапануем абрацьь газэту «Савецкая Беларусь».**

**Просім газэты «Палеская Праўда» «Віцебскі Пралетары» і «Камунар Магілеўшчыны» перадрукаваць наш ліст.**

З пралетарскім прывітаньнем дэпутаты Гомельскага гарсавету ад Гомсельмашу:

Старшыня (Старшыня)
Вітаўт (Вітаўт)
Дворнік (Дворнік)
Юрыкевіч (Юрыкевіч)
Жулай (Жулай)

## „Савецкая Беларусь" уключаецца ва ўсесаюзную ўборачную эстафэту Саветаў

**Тэлеграма. Масква, рэдакцыі газэты „Социалистическое Земледелие"**

Падтрымліваючы ініцыятыву Сьцябліцкага сельсавету, Армавірскага раёну, Паўночна-Каўказкага краю і газ. «Соц. Земледелие» рэдакцыя газэты **«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»»** уключаецца ў абвешчаную Ўсесаюзную ўборачную эстафэту Саветаў і ўдарным парадкам выпрацоўвае маршруты эстафэты па БССР выкарыстоўваючы вопыт праведзенай нашай газэтай Ўсебеларускай эстафэты перавыбараў Саветаў.

Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь»

**АД РЭДАКЦЫІ:** Адозва Сьцябліцкага сельсавету аб арганізацыі Ўсесаюзнай уборачнай эстафэты Саветаў будзе надрукавана ў заўтрашнім нумары нашае газэты.

**10 чэрвеня ўсебеларускі зьезд рабселькораў**

## ШЫРОКІМ АБГАВАРЭНЬНЕМ ТЭЗІСАЎ ДА ЗЬЕЗДУ

Абгаворваем праекты тэзісаў да ўсебеларускага зьезду рабселькораў

аб спажыўкаапэрацыі, паскорым яе перабудову на аснове рашэньняў партыі і ўраду

тварам да сацыялістычнага будаўніцтва

**Падрыхтоўка да зьезду па Віцебшчыне стаіць на шляху поўнага правалу**

### Віцебскі гарком партыі

**у справе падрыхтоўкі да зьезду абмяжаваўся прыняцьцем пастановы па гэтым пытаньні**

На прадпрыемствах Віцебшчыны па пытаньні падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў і прапрацоўкі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскай працы, разгорнута вялікая работа. На ўсіх прадпрыемствах былі праведзены і праводзяцца зьлёты рабселькораў, апроч таго на некаторых прадпрыемствах «Чырвоны Мэталіст», «Сьцяг Індустрыялізацыі» і панчошная фабрыка праводзяцца цэхавыя зьлёты рабкораў на якіх абгаварваюцца праекты тэзісаў па пытаньні зьезду.

Уся падрыхтоўчая работа па зьезду праходзіць пад знакам перабудовы рабселькораўскай работы і ўцягненьня ўдарнікаў у рабселькораўскія рады.

Побач з гэтым маюцца і такія прадпрыемствы, якія недаацэньваюць месячніку друку і перабудовы рабселькораўскай работы.

Удзел гарадзкога камітэту партыі ў месячніку друку і падрыхтоўцы да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў заключаецца толькі ў тым, што ён вынес пастанову. Далей гэтай пастановы нічога ня зроблена. У пастанове Гаркому партыі прапанавалася ўсім сакратаром парт'ячэек сельсаветаў не пазьней 10-га чэрвеня стварыць за ўсіх калгасах, саўгасах і сельсаветах насьценгазэты, але гэта пастанова ня выканана. Гэта пастанова таксама гаварыла каб на паседжаньні Бюро Гаркому заслухаць справаздачы на працягу гэтага месяцу рэдкалегій шматтыражак, і да гэтага часу ніводнай справаздачы рэдкалегій на паседжаньні бюро Гаркому ня было заслухана.

Газэта «Віцебскі Пралетары» таксама ў прыгарадных сельсаветах не папулярызуе месячніку друку. Усё гэта гаворыць аб тым, што з боку Гаркому партыі, а таксама і Гаркому камсамолу ня прынята мер для папулярызацыі рашэньняў партыі аб перабудове рабселькораўскага руху і падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

«Віцебскі Пралетары» ўключыўся ў рэйд па праверцы падрыхтоўкі прадпрыемстваў і ўстаноў да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў і аб'ектам праверкі ўзяты 10 буйнейшых прадпрыемстваў гор. Віцебску.

Віцебскаму Гаркому партыі трэба зьвярнуць больш ўвагі на рабселькораўскую работу.

**Брыгада «Савецкая Беларусь»**
**Н. Дварсон і Міркін.**

### Рабкоры Бабруйшчыны

**прынялі заклік рабселькораў Койданаўшчыны—абгаварылі тэзісы да зьезду аб каапэрацыі і ўнесьлі свае дадаткі**

Першы сход рабкораў-ўдарнікаў і каапэрацыйнага актыву, скліканы рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» сумесна з райкомам і рэдакцыяй раённай газэты, не адбыўся. Паўнейшам не паваротлівасьць і няўважлівасьць да прапрацоўкі тэзісаў да рабселькораўскага зьезду, якую праявілі партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, паслужыла прычынай зрыву сходу.

Другі сход адбыўся.

Рабкоры-ўдарнікі Бабруйскага цэрабкопу ўнесьлі ў тэзісы рад сваіх дадаткаў і прапаноў.

Так, у першы разьдзел тэзісаў аб гандлёвай дзейнасьці спажывецкай каапэрацыі ўнесены дадаткі:

«Кожны рабкор павінен быць актыўным змагаром за ажыцьцяўленьне гандлёва-фінансавага пляну сваёй крамы, актыўным дзеячом у справе давядзеньня гандлёва-фінансавага пляну ня толькі да кожнага працаўніка каапэрацыі, але да кожнага спажыўца.

У правядзеньні гэтай работы рабкор-ўдарнік і насьценны друк каапэрацыі павінен аказваць дапамогу каапэрацыйным камісіям».

Разьбіраючы і абгаворваючы разьдзел тэзісаў аб сустрэчы ўраджаю, рабкоры-ўдарнікі ЦРК унесьлі наступныя дадаткі:

«Рабкоры прыгародных гаспадарак павінны забясьпечыць штодзённае апэрацыйнае сьвятленьне ходу ўраджаю, мабілізуючы масы на пасьпяховае не заканчэньне і барацьбу з усімі недахопамі».

Па пытаньні аб рабочым кантролі ўнесены наступныя дадаткі:

«Рабкоры-ўдарнікі і нізавы друк спажывецкай каапэрацыі арганізуюць абмен вопытам з шэфскімі прадпрыемствамі і прадпрыемствамі, якія абслугоўваюць асобныя зьвены каапэрацыі, наладжваюць практычную дапамогу (узаемна) ў рабоце каапэрацыі і рабочага кантролю».

Вялікую ўвагу сходу прыцягнула пытаньне перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад і ўдзел у гэтым друку і рабкораскай армі.

Сход унёс па гэтым пытаньні ў тэзісы наступныя дадаткі:

«Рабкоры і ўдарнікі спажывецкай каапэрацыі павінны быць застрэльшчыкамі сацыялістычнай перабудовы падшэфных вёсак, арганізуючы практычную дапамогу ім у гэтым і праводзячы актыўную работу па наладжваньні каапэрацыйнай работы.

На гэтым сходзе рабкоры-ўдарнікі Бабруйскага цэрабкопу заявілі і аб тым, што кожны рабкор-ўдарнік, апроч непасрэднага ўдзелу ў друку, павінен быць і актыўным працаўніком па распаўсюджваньні друку наогул, і, ў прыватнасьці — каапэрацыйнага.

Па гэтаму пытаньню. У тэзісы ўнесены наступны дадатак:

«Рабкоры — ўдарнікі спажывецкай каапэрацыі павінны быць актыўнымі змагарамі за распаўсюджваньне каапэрацыйнага друку і наладжваньня культпрацы».

Гаворачы аб вярбоўцы ўдарнікаў у друк, аб практычным ажыцьцяўленьні лёзунгаў **«кожны рабкор — ударнік, кожны ўдарнік — рабкор»**, сход унёс у тэзісы дадатак, які гаворыць аб барацьбе за чыстату рабкораўскіх—ударніцкіх радоў.

У гэтым дадатку гаворыцца:

«Разам з штодзённым актыўным удзелам у вярбоўцы ўдарнікаў у рабселькораўскія рады рабкоры спажывецкай каапэрацыі павінны рашуча змагацца за чыстату гэтых радоў».

У сваёй пастанове сход адобрыў тэзісы і цалкам да іх далучыўся заявіў, што пастановы Ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду будуць пакладзены ў аснову работы рабкораў і нізавога друку па перабудове спажывецкай каапэрацыі.

**А. Дамброўскі.**

**Ударнік маслазаводу т. БУШУЕЎ.**

## Рацыянальным выкарыстаньнем тары

**захаваем тысячы рублёў сродкаў**

Тара зьяўляецца аспоўным зьвяном у выкананьні гандлёвага фінпляну, а таксама ў зьніжэньні сабекошту і розных накладных расходаў. Апроч гэтага, яна зьяўляецца і сродкам мабілізацыі грашовых сродкаў і рэсурсаў краіны.

Наша рабселькораўская армія таксама як і адпаведныя арганізацыі павінны зьвярнуць сваю сур'ёзную ўвагу на гэты бок справы. Надыходзячы Ўсебеларускі зьезд рабселькораў павінен даць адпаведныя ўказаньні наконт работы ў гэтым напрамку.

1. Рабселькоры павінны ўзяць на сябе ініцыятыву па арганізацыі па ўсіх пунктах БелУтыля БССР збор мяшкоў і ўтылю, што паддаюцца мыцьцю і латаньню, бо часта ва ўтыль трапляюць мяшкі годныя для грузазвароту пад плодагародніну.

Такім чынам, гэтыя мяшкі могуць быць, бясспрэчна, скарыстаны, прычым неабходна памятаць, што кожных 1000 мяшкоў, узятыя ва Ўтыльсыравіне могуць забясьпечыць разгрузку 3—5 вагонаў сыпучых грузаў.

Вось тут і павінны дапамагчы справе рабселькоры, а таму я прапаную ў тэзісах запісаць:

2. Рабселькоры павінны прыняць удзел у вынаходжаньні іншых шляхаў выхаду з існуючага становішча, павінны ўзяць пад свой нагляд работу БКС, Наркамснабу, Саюзхлеба і інш. устаноў, якія маюць дачыненьне як непасрэдна да справы загатоўкі плода гародніны, таксама і да водпуску адпаведных матэрыялаў для падрыхтоўкі патрэбнай колькасьці тары. Рабселькоры павінны змагацца з ліквідацыяй абязьлічкі на тару.

Абмен вопытам у гэтай галіне работы вузкае месца. Таму я прапаную запісаць у тэзісах:

2. Рабселькоры павінны папулярызаваць работу лепшых арганізацый у справе забясьпечаньня тарай загатоўчай кампаніі па плодагародніне, надаць ёй масавы характар і тым самым прыняць практычны ўдзел у вырашэньні тэзіса важнай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

**Мікерын.**

# ПРАПОЛАЧНАЙ, БАЛЬШАВІЦКАЙ УБОРКАЙ ЗАМАЦУЕМ перамогі вясны

## Біцца за якасьць ільнапасеваў

**Пасьпяховым выкананьнем пасеўных заданьняў ня скончылася барацьба за лён!**

Пасеўнае заданьне другой бальшавіцкай вясны па пашырэньні ільнапасеваў выканана, але гэта яшчэ не азначае, што выкананы задачы, пастаўленыя перад сельскай гаспадаркай БССР у галіне забясьпячэньня прамысловасьці ільна-сыравінай. Пасьпяховае выкананьне вясенняй сяўбы толькі паказвае, што мы сталі на шлях выкананьня гэтых задач і што ўжо зрабілі першы крок на гэтым шляху.

Вясенняя сяўба—першы крок.

**Наперадзе—дагляд за пасевамі, уборка, першапачатковая апрацоўка. «Вопыт мінулага году паказвае, што супакоіцца на посьпехах калектывізацыі і пасеўнай кампаніі і недаацэньваць усю сур'ёзнасьць задач у галіне замацаваньня калгасаў і ўборкі ўраджаю, адзначала-б нанесьці вялізарную шкоду справе калектывізацыі»** (з рэзалюцыі пленуму УсеКП(б) па дакладу т. Якаўлева).

Гэту перасьцярогу неабходна ўлічыць і, ня ўсьпяючы сябе посьпехамі, дасягнутымі сяўбой, адразу пераключыцца з сяўбы на арганізацыю дагляду за ільнапасевамі і на падрыхтоўку да ўборкі і першапачатковай апрацоўкі лёну.

Пасьля пасьпяховага выкананьня сяўбы паўстала задача павялічыць колькасныя дасягненьні вясны на якасьць ільнапасеваў.

Аднак, на вырашэньне гэтай задачы яшчэ не перабудаваліся цэнтральныя і асабліва раённыя ўстановы і арганізацыі, а таксама не мабілізавана грамадзкасьць.

У мэтах арганізацыі барацьбы за якасьць ільнапасеваў Наркамземам распрацаваны і спушчаны ў раёны агратэхнічныя мерапрыемствы па падвышэньні ўраджайнасьці і якасьці ўраджаю лёну (пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства БССР ад 5 мая 1931 году, якая зацьверджана Саветам Народных Камісараў БССР).

Райза, Райкалгассаюзам і Райкаапсаюзам прапанована правесьці шырокую растлумачальную работу па ўжываньні апрамінімуму абмеркаваць яго на агульных сходах рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-сераднякцкага селянства, пры чым быў вызначан пэўны тэрмін для правядзеньня гэтай працы—20 мая, але і да гэтага часу пастанова Наркамзему раённымі арганізацыямі не выконваецца.

Апрамінімум па лёне да пасеўшыкаў не даведзены. Гэта сьведчыць аб няўважлівых адносінах да пытаньняў павялічэньня ўраджайнасьці і якасьці ўраджаяў лёну з боку раённых арганізацый і ў першую чаргу з боку Райза, як непасрэдных кіраўнікоў сельска-гаспадарчай вытворчасьцю.

У **барацьбе за якасьць ільнапасеваў задачай сеньняшняга дню зьяўляецца поліва лёну.**—У сувязі са значным пашырэньнем ільнапасеваў, з увядзеньнем вялікага проц. лёну у агульнай пасеўнай плошчы, гэта мерапрыемства набывае асаблівае значэньне і патрабуе абавязковага ўжываньня, але на практыцы мы сустракаемся з недаацэнкай значэньня поліва лёну, у выніку чаго правядзеньне гэтага мерапрыемства не было характару масавай кампаніі. Раённыя арганізацыі зусім не займаюцца гэтай справай, прадаставіўшы яе хвалям самацёку.

У мэтах арганізацыі кантролю за правядзеньнем поліва лёну Наркамземам устаноўлена пэрыядычная справаздачнасьць аб ходзе поліва. Пачынаючы з 10-га чэрвеня Райза павінны прадстаўляць у Наркамзем зьвесткі аб колькасьці прапоўтых ільняных гектароў, але да апошніх дзен ні адзін раён гэтых зьвестак не даваў.

Праполачная кампанія не арганізавана. Поліваем ніхто не кіруе. Калі дзе і праводзіцца гэта мерапрыемства, дык праводзіцца самацёкам, бяз усякага ўліку.—Праступная бязьдзейнасьць раённых арганізацый ставіць пад пагрозу ўраджайнасьць 240.000—га лёну. Неабходна зараз-жа пазбавіць канец гэтай бязьдзейнасьці.

Неабходна бездакладна пераключыцца на правядзеньне поліва з тым каб засеянныя 240.000 га лёну далі прадукцыю і забясьпечылі б прамысловасьць ільнасыравінай.

Час не чакае. Вызначаныя Наркамземам тэрміны полкі праходзяць

Нельга чакаць ні хвіліны.

Арганізаваць шырокую кампанію па преполцы ільнапасеваў.

Замацаваць праполкай перамогу вясны.

**Г. М.**

## СПАДЗЯЮЦЦА НА САМАЦЁК

Кампанія лёназагатовак па Надальскім сельсавеце, Бягомльскага раёну, прайшла самацёкам. Вестак у сельсавеце аб процанце выкананьня няма. Плян пасеву лёну па заданьнях, даведзеных да двара, ня выкананы (в. Тартак і інш.), бо сталай праверкі гэтае справы ня было. Некаторыя калгасы індбайна адносіліся да гэтай важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі, яны не мабілізавалі актыўнасьці калгасьнікаў вакол гэтага пытаньня.

Калгас «Краіна Саветаў» і на сёньня мае некалькі коп нямят

# КАЛГАСЬНІКІ БССР!

## Да вас зьвяртаюцца калгасьнікі Койданаўшчыны з заклікам на хутчэйшую рэалізацыю пазыкі „3-га рашаючага"

### Падтрымаем ініцыятыву калгасьнікаў Койданаўшчыны, разгорнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, выканаем заданьні поўнасьцю і ў тэрмін

## Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК выканаем пазыковую праграму

МАСКВА. ЦК УсеКП(б)—тав. СТАЛІНУ, СНК СССР—тав. МОЛАТАВУ, НКФ СССР—тав. ГРЫНЬКО, ЦО—«ПРАВДЕ».

Кантрольная лічба рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» на 2-га ліпеня сярод рабочых і служачых БССР у суме 23.400.000 руб. выканана на 100 проц. Рэалізацыя працягваецца.

Шырока разгортваем рэалізацыю пазыкі на вёсцы.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), бальшавіцкімі тэмпамі выканаем і перавыканаем пазыковую праграму.

Сакратар ЦК КП(б) ГЕЙ.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
Нарнамфін БССР ХАЦКЕВІЧ.

## Бальшавіцкімі тэмпамі забясьпечым рэалізацыю пазыкі на вёсцы

ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б, ЦК КП(б)Б—тав. ГЕЮ, ЦВК—тав. ЧАРВЯКОВУ, СНК—тав. ГАЛАДЗЕДУ, ЦСПС—тав. РЫЖОВУ, ЦО «Зьвязда».

Энтузіязмам рабочае клясы пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б кантрольная лічба рэалізацыі пазыкі «трэцяга рашаючага году пяцігодкі» сярод рабочых і служачых БССР у суме 23.400 тыс. руб. выканана на 100 пр. Рэалізацыя працягваецца.

Пераключаемся на другі важнейшы этап кампаніі—рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Бальшавіцкімі тэмпамі пад неаслабным і цьвёрдым кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі забясьпечым выкананьне рэалізацыі пазыкі на вёсцы да 1-га жніўня.

Нам Нарнамфін АБРАМСОН.
Начальнік кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту ЗАХАРАВА.

## Запэўніваем партыю, што заданьне сярод калгасьнікаў будзе выканана

ЦК КП(б)Б—тав. ГЕЮ, Старшыні ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ, Нарнамфіну—тав. ХАЦКЕВІЧУ.

Зьлёт ударнікаў калгасьнікаў і калгасьніц СУРАСКАГА раёну вітае выпуск пазыкі «трэцяга рашаючага году». Улічваючы вялізарнае значэньне пазыкі ў фінансаваньні народнае гаспадаркі,—мы ўдарнікі калгасьнікі датэрміновa падпісваемся на месячны заработак кожны.

Запэўніваем партыю і ўрад, што да дзеня кантрольная лічба сярод калгасьнікаў будзе выканана на 100 пр.

Прэзыдыум зьлёту.

## Абвяшчаем ударны месячнік па рэалізацыі пазыкі

### Да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў БССР

Мы рабочыя і калгасьнікі Койданаўскага раёну,—раёну суцэльнай калектывізацыі,—сабраўшыся на аб'яднанае насяджэньне Цэнтральнай Камісіі садзейнічаньня Дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры ЦВК БССР сумесна з камісіяй Белкалгасцэнтру і раённай камісіяй Койданаўскага раёну, улічваючы вялікае значэньне пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» для сацыялістычнага будаўніцтва, для завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі і хутчэйшага заканчэньня пуску ў 1931 г. 518 новых гігантаў фабрык і заводаў і 1040 машына-трактарных станцый,—абавязваемся: ахапіць усіх працоўных падпіскай на пазыку ў разьмеры ня менш трохтыдневага даходу кожнага калгасьніка і аднаасобніка і скончыць падпіску на пазыку не пазьней 25-га ліпеня 1931 г.

Для выкананьня гэтага, мы абвяшчаем ударны месячнік, у які, ў парадку сацспаборніцтва і ўдарніцтва, поўнасьцю падпісаўшыся самі на пазыку, будзем актыўнымі праваднікамі пазыкі сярод адстаючых калгасьнікаў і аднаасобнікаў каб забясьпечыць поўны ахоп іх падпіскай на пазыку. Мы выклікаем на лепшае правядзеньне падпіскі ў парадку сацспаборніцтва Менскі, Клімавіцкі і Лепельскі раёны.

Мы, калгасьнікі Койданаўшчыны, заклікаем усіх калгасьнікаў БССР пасьледаваць нашаму прыкладу і выклікаць на сацспаборніцтва іншыя раёны, каб ударнымі тэмпамі і сацыялістычнымі мэтадамі працы ў самы кароткі тэрмін закончыць поўны ахоп падпіскай усіх працоўных БССР у разьмеры ня менш трохтыднёвага даходу.

Няхай жыве камуністычная партыя, няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва.

Рабочыя і калгасьнікі Койданаўшчыны.

## Выклікаю на сацспаборніцтва ўсіх сельскораў — „Савецкай Беларусі"

Я, селькор газэты «Савецкая Беларусь», вучань Слуцкай профшколы гародніцтва Саўгасвучу, зразумеўшы важнасьць хутчэйшай рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі», абвясьціў сябе ўдарнікам. Падпісаўся на 170 проц. месячнага заработку і выклікаў на сацспаборніцтва ўсіх вучняў і настаўнікаў Саўгасвучу. Выклік падхоплены. Ужо ёсьць значныя вынікі. Лічба ў 2.000 руб. якая была прынята агульным сходам, выканана больш як на 200 проц.

Сацспаборніцтва на гэтым фронце працягваецца. Наперадзе ідуць вучні: Плахоцкі, Малашка, Чуеўская, Астрэйка і інш. Вучань Сырыцкі катэгарычна адмаўляецца ад падпіскі.

Выклікаю на сацспаборніцтва ўсіх сельскораў газэты «Савецкая Беларусь».

Алесь Шпакоўскі.

## Раўненьне па брыгадзе т. Шчалкунова

### Брыгада т. Шчалкунова ўзнагароджана адзнакай ударніка („Давідаўка")

Тэмпы выпрацоўкі машына-фармовачнага торфу павялічваюцца. За апошнія дні выпрацоўка брыгады Шчалкунова выражаецца ў наступных лічбах. 23-га чэрвеня—60.100, 24-га чэрвеня—59.500, на 27.га: брыгада Шчалкунова дае 69.000 цаглін, брыгада Маслова Н.—44.000, брыгада Перапёлкіна—39.700 і брыгада Маслава І.—34.800.

Прычым, трэба адзначыць, што дзённая норма для брыгад—35.000 цаглін, Брыгады абодвых Маславых у гэты дзень не—працавалі 2½ гадзіны з-за дрэннага надвор'я. Усяго на 27-га чэрвеня праграма па машынафармовачным торфе выканана на 134 проц.

Брыгада Шчалкунова атрымала ад цэлага раду арганізацый прывітальныя тэлеграмы.

Прэзыдыум ЦП саюзу тарфянікаў і славцовай прамысловасьці ўзнагароджаў адзнакамі ўдарнікаў удзельнікаў брыгады Шчалкунова, а Шчалкунова запрашае на пленум ЦП саюзу. Брыгада Шчалкунова ўключаецца ў конкурс на прэміраваньне.

Мітынг брыгад пастанавіў на дасягнутых посьпехах не супакойвацца. Трэба адзначыць, што зусім дрэнна абстаіць справа ў «Давыдаўцы» з фрэзерным торфам, які яшчэ не пачаў вырабляцца.

Асноўнай прычынай затрымкі з фрэзерам зьяўляецца няспраўнасьць трактара і адсутнасьць неабходных частак. Але на сёньняшні дзень трактар ужо спраўлены, неабходныя часткі прыбылі і гэтымі днямі фрэзер пачне працаваць.

Апроч таго, у суседнім саўгасе на час спыненьня палявых работ будзе пазычаны трактар, што дасьць магчымасьць ліквідаваць прарыў па фрэзерным торфе.

Л. В. Сандлер.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 151 (3240)

## Абслужым 9 калгасаў і 4 вёскі

### Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" і ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў

Калектыў МК складаецца з 54 асоб. На сёньняшні дзень падпіскай ахоплена 51 чалавек, зарплата—7.185 руб., сума падпіскі — 7,130 руб. Ня 100-процантны ахоп тлумачыцца адсутнасьцю членаў нашага калектыву, якія знаходзяцца ў камандыроўках. 16-га чэрвеня мясцкомам было вылучана 10 асоб, якія зрабілі налёт на прадпрыемствы з мэтаю ўстанаўленьня становішча з падпіскай на пазыку.

17-га чэрвеня арганізавана брыгада з 18 асоб, іх прымацавалі непасрэдна да прадпрыемстваў. Яны штодзень пасьля сваёй работы, а таксама ў выхадныя дні праводзілі работы на гэтых прымацаваных прадпрыемствах (абход рабочых па цэхах у часе абедзенных перапынкаў, гутаркі, прымалі ўдзел у выданьні насьценгазэты, рабілі даклады на сходах рабочых і гэтак далей). Усе прымацаваныя заставаліся на прадпрыемствах для работы да канца поўнага ахопу рабочых падпіскай і канчатковага афарміленьня. У выніку гэтага мы маем наступны ход падпіскі ў прымацаваных да нас прадпрыемствах: фабрыка «Усход»—рабочых 720 чалавек, падпіскай ахоплена 654 чал., сума зарплаты—61.000, сума падпіскі—51.200 руб. Завод «Пралетары»—рабочых 319 чалавек, падпіскай ахоплена — 250 чал., сума зарплаты—26,000 руб., сума падпіскі—13.200 руб. Фабрыка імя Крупскай Рабочых—605 чалавек, ахоплена падпіскай — 474 ч., сума зарплаты — 43.431 руб., сума падпіскі—34.230 руб. Завод «Бальшавік»—рабочых—832 чал., ахоплена—777 чал., зарплата—95.000 руб., сума падпіскі—88.075 руб. Першая савецкая больніца—служачых і рабочых—360 чал., ахоп падпіскай—252 ч., зарплата—13.000 р., сума падпіскі — 14.590 руб.

Зараз мясцком кіраўніцтва ашчадкас пераключае ўсе свае сілы на работу па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы. Калектыў ашчадкас узяў на сябе абслугоўваць поўнасьцю па рэалізацыі пазыкі 9 калгасаў і 4 вёскі.

Старшыня МК кіраўніцтва Ашчадкас БССР Чакорская.
Штабіст трывогі Шварц.

## Выканаўшы заданьне, работу працягваем

### Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" і ЦП саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў

#### Рапарт

Улічваючы ўсю палітычную і гаспадарчую важнасьць рэалізацыі пазыкі III-га рашаючага году пяцігодкі, ад якой залежыць забясьпячэньне сродка мі вялізарнейшай праграмы капітальнага будаўніцтва гэтага году, што ўзмацняе вытворчую базу ўсёй народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу і дапамагае выкананьню ўсяго фінпляну, калектыў супрацоўнікаў НКФіну, у выніку праведзенай падрыхтоўчай работы з боку МК і Камісіі Садзейнасьці дзяржкрэдыту пад кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б 13 чэрвеня ў адноўным скончыў падпіску на пазыку і па становішчы на 21 чэрвеня дабіўся, шляхам разгортваньня сацспаборніцтва і індывідуальных выклікаў, перавыкананьня прынятага сустрэчнага пляну рэалізацыі пазыкі ня менш месячнага заробку пры 100 процантным ахопе супрацоўнікаў.

Падпіскай ахоплена 124 супрацоўнікі—100 проц. Агульная сума падпіскі складае 20.935 руб.—102,8 проц. месячнага фонду зарплаты

Апрача таго, у выніку праведзенай работы сярод утрымванцаў працаўнікоў НКФіну, апошнія падпісаліся на 300 руб.

Шляхам далейшага разгортваньня сацспаборніцтва і выклікаў падпіска працягваецца.

Праведзена работа па аказаньні дапамогі Камсодам 9 прадпрыемстваў гор. Менску на правядзеньні падпіскі на пазыку. Для гэтай мэты была вылучана група ў колькасьці 19 працаўнікоў.

Групай з 13 таварышоў праведзена праверка па ліквідацыі запазычанасьці плацяжоў 1-га выпуску пазыкі і разгортваньня кампаніі па II выпуску пазыкі па 15 установах і прадпрыемствах гор. Менску.

На дапамогу раёнам у справе арганізацыі кампаніі па распаўсюджваньні пазыкі з увязкай работы па іншых кампаніях (мабілізацыя сродкаў, вучот аб'ектаў абкладаньня), было накіравана 18 асоб.

Работу працягваем, пераключаемся для работы на вёсцы.

МК НКФ Варонін.
Камсод Алейнікаў.

Ня гледзячы на тое, што на працягу чэрвеня павінна было быць засіласавана 10 проц. пляну ці 100 тысяч тон сіласнай масы фактычна засіласавана 6.246 тон: калгасы 5.566 тон, і саўгасы 690 тон, што складае ў агуле 0,6 проц. Зусім не праводзіць сіласаваньня аднаасобны сэктар. Пераважная большасьць раёнаў не прыступіла яшчэ да сіласаваньня. Райкалгассаюзы і сельсаветы мала зьвяртаюць увагі на правядзеньне мерапрыемстваў па сіласаваньні кармоў.

Так далей справа цягнуцца ня можа ў правядзеньні сіласнай кампаніі. Трэба дабіцца максымальнага выкарыстаньня траў на сілас, прыняўшы пад увагу тое, што плян засеву сіласных культур выкананы ўсяго на 34 проц. У бліжэйшыя часы неабходна забясьпечыць 100 проц. пабудову вежаў, ям і траншэй. Неабходна таксама распрацаваць канчатковыя нормы выпрацоўкі па сіласу і намеціць прыкладную рабочую праграму.

Неабходна разгарнуць сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас вёскі шырокую масавую работу і разьбіць кулацкую агітацыю супроць сіласу.

Плян сіласаваньня можна і трэба выканаць.

К. І.

# Чэрвеньскі плян сіласаваньня сарваны

## Да 1-га ліпеня засіласавана ўсяго 0,6 проц. месячнага пляну, будаўніцтва ям і траншэй выканана на 1 проц., сілосных веж—36 проц.

### Прэч самацёк і бязьдзейнасьць у правядзеньні сілоснай кампаніі! Калгасы і саўгасы павінны стаць у авангардзе барацьбы за сілос

## Дабіцца плянавага правядзеньня сілоснай кампаніі

Сілосная кампанія праходзіць яўна нездавальняюча па ўсіх вучастках работы: будаўніцтва сілосных установак разгортваецца вельмі марудна, сіласаваньне амаль не пачыналася і г. д.

Да 1-га ліпеня прамысловасьць Савецкай Беларусі павінна была выпусьціць 388 сілосных вежаў, з якіх 247 для БССР, а рэшта для іншых рэспублік Савецкага Саюзу. Фактычна-ж на гэты тэрмін адгружана 91 вежа—90 для БССР і адна для Ленінградзкай вобласьці. Такія тэмпы будаўніцтва сіласных веж ставяць пад пагрозу своячасовае запаўненьне вежаў сілоснай масай.

Ня лепш стаіць справа і з будаўніцтвам іншых сіласных установак—ям і траншэй. На 1-га ліпеня пабудавана 20.266 кубаметраў ям і траншэй, што складае 1 проц. пляну. Прымаючы пад увагу тое, што 90 проц. масы будзе сіласавацца ў ямах і траншэях, трэба ўжыць рашучыя захады каб у бліжэйшыя дні шырока разгарнуць будаўніцтва гэтага віду сілосных установак.

Адначасова з гэтым трэба поўнасьцю забясьпечыць будаўніцтва сілосных вежаў цьвікамі, толем і цэментам. Да гэтага часу ня высьветлена пытаньне, якім парадкам будзе атрымліваца толь. Белсельснаб павінен зараз-жа накіраваць прыёмшчыкаў у Ленінград за атрыманьнем толю, не чакаючы на тое, пакуль нарады будуць атрыманы.

## Выпуск вежаў па-ранейшаму тармозіцца

### Завод „Дрэваапрацоўшчык" і Бабруйскі камбінат ня выконваюць узятых на сябе абавязкаў

Шпаркае разьвіцьцё жывёлагадоўлі цесна ўвязана з мерапрыемствам: па стварэньні моцнай кармовай базы.

Сіласаваньне кармоў у гэтай справе адыгрывае не апошнюю ролю. Гэта вымагае фарсаваньня будаўніцтва сілосных установак, у прыватнасьці сілосных вежаў. Між тым на гэтым вучастку работы ёсьць яўна небясьпека зрыву. Прамысловасьць ня выконвае ўзятых на сябе абавязкаў, будаўніцтва сілосных вежаў тармозіцца. Тэмпы работы па выпуску вежаў заводам «Дрэваапрацоўшчык» і Бабруйскім камбінатам зусім незадавальняючыя.

Таблица адгрузкі сіласных установак яскрава сьведчыць аб гэтым:

| Назва заводаў | Пяцідзёнка з 6 па 10/VI | 11—15 VI | 16—20 VI | 21—30 VI | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| Завод „Дрэваапрацоўшчык" | 5 | 6 | 8 | 16 | 35 |
| Бабруйскі камбінат | 12 | 14 | 8 | 22 | 56 |
| Разам | 17 | 20 | 16 | 38 | 91 |

Усяго па пляну да 1-га ліпеня г. г. заводы павінны былі здаць 388 вежаў. Засталося адгрузіць яшчэ 297 вежаў, а ўсе тэрміны прайшлі.

Неабходна безадкладна прыняць рашучыя меры. Ці думае Лесбел пасылаць сваіх упаўнаважаных на заводы?

Заводакіраўніцтва, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны мабілізаваць на выкананьне пляну будаўніцтва вежаў, пара спыніць апартуністычны самацёк.

І. Фрыдман.

## Выкарыстаць пустазельле на сілос

### Прымусіць саўгас імя Лекерта ўзяцца за работу

У Менскім прыгарадным саўгасе імя Лекерта аб сіласаваньні кармоў ніхто ня думае. Сілосныя ямы не адрамантаваны, у іх поўна вады, сьмецьця.

Сіласаваньне кармоў можна было пачаць, выкарыстаўшы дзеля гэтага траву ад поліва трад. Саўгас мае 20 га гуркоў, 25 га памідораў, 5 га кукурузы, 5 га сланечніку, 10 га капусты, 8 га буракоў і шмат іншай культуры, але ўся трава ад поліва марна гніе.

Пытаньнем сіласаваньня ня цікавіцца ні адміністрацыя, ні партыйная ячэйка, ні рабфакам.

Трэба безадкладна прыступіць да сіласаваньня кармоў. Зрыўшчыкаў сіласаваньня неабходна прыцягнуць да адказнасьці.

Зорні.

## Сіласаваньне пад пагрозай зрыву

### Аб чым дбае Старасельскі сельсавет?

Па ўсіх калгасах Старасельскага сельсавету, Копыскага раёну, сіласаваньне кармоў яшчэ не пачата. Сіласныя ўстаноўкі—ямы, траншэі, ня будуюцца ні ў водным калгасе. Па большасьці калгасаў зусім ня сеялася сіласныя культуры. Калгас «Бальшавік» атрымане насеньне сланечніку разбазарыў на спажывецкія патрэбы.

Да сіласаваньня пустазельля і асакі не прыступілі. Калгас «Новае Жыцьцё» мае значную плошчу занятую добрай травой, ня прыдатнай на сена, але нічога ня робіць, каб засілаваць яе.

Усім калгасам Старасельскага сельсавету трэба зараз-жа ўзяцца за будаўніцтва сіласных ям і траншэй і пачаць сіласаваньне кармоў.

Ударная брыгада газ. «Сав. Бел.»:
Зэйгер Д., Катлоўскі.

## Сіласаваньне кармоў—забыты вучастак працы

Па Даманавіцкім сельсавеце, Мазырскага раёну, сіласаваньне кармоў—забыты вучастак працы. Ня гледзячы на шырокія магчымасьці па сіласаваньні кармоў у гэтай галіне нічога ня робіцца, да сіласаваньня кармоў яшчэ ня прыступілі. РВК і сельсавет павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на належнае правядзеньне сілоснай кампаніі.

Брагада газ. «Сав. Бел.»:
С. Сяргейчык, А. Гундараў, Я. Войтаў.

# Зьдзельшчына, вучот, рабочыя пляны, арганізацыя брыгад—неадлучны ад барацьбы за бальшавіцкі ўраджай

## Зьдзельшчына—вялізарная яшчэ ня вычарпаная крыніца ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы. Гэтая крыніца павінна быць поўнасьцю выкарыстана ў час уборачнай кампаніі

## Вучот працы замацуе зьдзельшчыну

Пытаньне зьдзельшчыны ў калгасе «Сьвет» Бабруйскага раёну не папуля рызавана як след сярод шырокіх мас калгасьнікаў.

З пачатку вясновай пасеўнай кампаніі нормы выпрацоўкі былі выпрацаваны, уся праца была пераведзена на зьдзельшчыну, але гэтае пачынаньне ня было як след замацавана толькі таму, што ня было правільнага і своя часовага вучоту працы.

Вучотам працы ведаў сам старшыня калгасу тав. Баркоўскі. Перагружанасьць не давала магчымасьці наладзіць дакладнага вучоту, а брыгадзіры не адказвалі за вучот выпрацоўкі сваёй брыгады. У выніку ўзьнікла шмат непаразуменьняў: ад пачатку году аж да мая месяца ня ўлічаны працадні калгасьніц, за красавік ня былі ўлічаны працадні калгасьнікаў. І толькі 26 чэрвеня неяк былі сабраны гэтыя весткі.

Ня зусім добра абстаіць справа і з вучотам працадзён па сяўбе. Калі па ворыве і другіх галінах быў некаторы вучот выпрацоўкі, дык па баранаваньні, сьвінагадоўлі, жывёлагадоўлі і іншых галінах гаспадаркі гэтага зусім ня было. Вучот працадзён па гэтых работах быў прыблізны: адзінка з со тымі, альбо бяз сотых, што па сутнасьці не адрозьніваецца ад «палачнай» сыстэмы.

Трэба адзначыць, што і райкалгассаюз несваячасова даслаў працоўныя кніжкі для калгасьнікаў.

Брыгада, пасланая для праверкі вучоту працы ў калгас, можа і павінна зараз-жа зрабіць вучот працадзён за веснавую сяўбу і праполачную кампанію і запісаць іх у працоўныя кніжкі калгасьнікаў.

Вучот выпрацоўкі працадзён павінен весьці палявод і брыгадзіры ў кожнай брыгадзе паасобку; гэта разгрузіць старшыню і дасьць дакладны вучот. На дапамогу наладзіць правільны вучот працы трэба мабілізаваць актыў калгасаў (настаўніцтва і інш.).

Выправіўшы недахопы, наладзіўшы дакладны вучот, калгас «Сьвет» замацуе зьдзельшчыну і гэтым значна палепшыць ўсю работу і становішча гас падаркі.

Брыгада газ. «Сав. Бел.» і «Камунікст» Канцэльсон, Пінчук, Кржаноўскі, Юхнавец.

## Адмовіліся дапамагчы пяцідзёньніку

БАРЫСАЎ. (Наш спец. кар.). З калгасаў Барысаўскага раёну пачынаюць варочацца брыгады, пасланыя для правядзеньня пяцідзёньніка праверкі вучоту працы. Па вестках прысланых з месц, відаць, што рэйд прайшоў больш-менш пасьпяхова.

Праўда, брыгадамі не ахоплены ўсе 23 сельсаветы раёну. У 4 сельсаветы не пасланa зусім брыгад з той прычыны, што райкаапсаюз, ЦРК, макаронная фабрыка, «Чырвоная Бярэзіна», Леспрамгас і Трансспажыўтаварыства катэгарычна адмовіліся дапамагчы пяцідзёньніку. Яны не паслалі ў калгасы ніводнага рахункоўка работніка.

Зараз усе працакніжкі разданы на рукі кожнаму калгасьніку. У тых калгасах, дзе ёсьць рахунковыя работнікі вучот працы ўжо скончаны. Падлічаны усе працадні з новага году аж да ўборачнай і занесены ў працоўныя кніжкі.

Пры раздачы кніжак нечакана сустрэліся вялікія труднасьці. Малапісьменныя брыгадзіры вельмі дрэнна вылічвалі працадні і за два дні нарабілі ў кніжках шмат блытаніны. Прышлося тэрмінова вучыць іх весьці правільны падлік працы. Напрыклад, у Лазіне—нацыянальны сельсавет суцэльнай калектывізацыі—з 12 брыгадзіраў аддзяленьняў калгасу «Домбаль» толькі 8 умеюць весьці падлік працадзён, а 4 зусім ня могуць. Іх увечары пасьля работы рахункаводы падвучваюць і толькі дні праз 3-4 іх можна будзе даць на рукі кніжкі для самастойнага запісу.

Корсік.

## Кніжкі не дайшлі яшчэ да калгасьнікаў

Па Старобінскім раёне з 25 чэрвеня пачаўся пяцідзёньнік праверкі вучоту працы ў калгасах. Для правядзеньня пяцідзёньніка камандыраваны рад таварышоў з райактыву. Ня гледзячы на жорсткія дырэктывы райкому партыі і райкалгассаюзу аб узядзеньні зьдзельшчыны ў калгасах, наладжаньні правільнага вучоту працы і выдачы працоўных кніжак калгасьнікам, да гэтага часу нічога ня зроблена.

Напрыклад, па калгасах Лістападавіцкага с-с ніводзін калгасьнік не атрымаў на рукі працоўнае кніжкі. У калгасе «Камунар» больш двух тыдняў ляжаць працакніжкі ў канцылярыі калгасу, а калгасьнікам яны не выдаюцца і працадні ў іх не запісваюцца з прычыны бязьдзейнасьці разьлікавода. Ніхто з калгасьнікаў ня ведае колькасьці выпрацаваных працадзён у час пасеўнай і праполачнай кампаній.

Яшчэ горш абстаіць справа з вучотам працы ў калгасе «Камінтэрн». Тут, вучот зусім не наладжан, няма і рахункавода, а зьдзельшчына ўведзена толькі фармальна. Палявод калгасу заяўляе, што ня праполты лёну, альбо проса нельга ўстанавіць зьдзельшчыны.

Амаль нічога не зрабіў у гэтай галіне РК камсамолу; ён не мабілізаваў камсамольцаў на дапамогу калгасам па праверцы вучоту працы ў калгасах.

Райкалгассаюз павінен зьвярнуць увагу на гэткае становішча ў калгасах. Правільны вучот працы ў калгасах павінен быць наладжан.

Г. Скуценя.

## Няма той вёскі, дзе ня было-б прыліву

Самахвалавіцкі сельсавет, Менскага раёну, вучот аб'ектаў абкладаньня ўвязаў з разгортваньнем новага калгаснага прыліву.

Папулярызацыя новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку, асабліва льгот калгасам і калгасьнікам па с-с падатку, пасьпяхова праведзеная вясновая сяўба зьявіліся стымулам для далейшага разгортваньня калектывізацыі. У в. Самахвалавічы ўступіла ў калгас 16 бядняцка-сераднякіх гаспадарак, у в. Белцы—13, у в. Валіцкаўшчыны—8, у в. Русіновічы—6, у в. Вуглы—10, у в Цімошкі—5.

Няма той вёскі ў сельсавеце, дзе ня было-б прыліву або цэлымі групамі, або адзіночкамі. Беднята і сераднякі-аднаасобнікі, якія яшчэ ня ўступілі ў калгасы, зяўляюць, што да восені ўсе будуць у калгасах.

Корч.

## Ураджай сустрэць падрыхтаванымі

Старасельскі сельсавет, Капыльскага раёну, у выніку пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы калектывізаваны на 88,2 проц.

Аднак, падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі праходзіць нездавальняюча. Сельска-гаспадарчыя машыны не адрамантаваны, а новыя не забраны са складу райкалгассаюзу, ня прыведзены ў парадак і не агледжаны памяшканьні для складу сена і збожжа.

Старшыні некаторых калгасаў не па забавілося ад шкодных разважаньняў, што «яшчэ пасьлеем з уборачнай, калі ня хопіць машын,—зьбярэм уручную».

Яшчэ горш у аднаасобным сэктары. Тут ніхто нічога ня робіць і да ўборкі зусім ня рыхтуюцца.

Пастанова НКЗ СССР аб падрыхтоўцы да ўборкі сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў не папулярызавана. Сельсавету стаіць у баку ад падрыхтоўкі да ўборачнай. Партыйная і камсамольскія арганізацыі таксама ў гэтай галіне нічога ня робяць.

Брыгада газ. «С. Б.» Ул. Арэшкаў, Я. Каган.

## Першы раз чуюць пра вучот

У калгасе «Бальшавік», Копыскага раёну няма належнай арганізацыі працы. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце зусім адсутнічаюць. Калгасьнікі не адчуваюць ніякай адказнасьці за якасьці сваёй працы.

Пяцідзёньнік праверкі вучоту працы ў калгасе ня быў падхоплен; тут пра гэта першы раз чуюць. Вакол праверкі вучоту не мабілізавана грамадзкая думка.

Калгас «Бальшавік» павінен неадкладна поўнасьцю увесьці зьдзельшчыну, арганізаваць правільную расстаноўку рабочай сілы і наладзіць вучот працы.

Ударнік.

Праполка улік працы.

## За калгас—супраць кулака

**НА 1-ГА ЛІПЕНЯ ПА ЛЕПЕЛЬСКІМ РАЁНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ** бядняцка-сераднякіх гаспадарак дасягнула 81 проц.

Калгасамі раёну дадаткова засеяна 246 га лёну і 96 га канапель. Калгас «Шлях Леніна», Стайскага сельсавету, засеяў на новых запашках 10 га лёну. Па раёне праполата 285 га лёну, 118 га гародніны, скошана 601 га сенажаці і ўбрана 330 тон сена.

Селькоры калгасу імя Молатава арганізавалі ударную брыгаду друку па ўборцы ўраджаю. Брыгада друку, распрацаваўшы тэзісы зьезду, высунула прапанову пашырыць жывёлагадоўлю ў калгасе. Вылучана 5 асоб на курсы для кваліфікацыі па розных галінах жывёлагадоўлі.

На сёньняшні дзень па раёне выкапана 162 сіласных ямы ў 2.430 кубаметраў.

**У ВЕРАВАЙШАНСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ, АРШАНСКАГА РАЁНУ, КАЛЕКТЫВІЗАВАНА 98,4 ПРОЦ.** бядняцка-сераднякіх гаспадарак, аб'яднаных у 10 калгасах.

Апошняе месца ў справе калектывізацыі займае Бразьдзечынскі сельсавет, дзе ў калгасы аб'яднана толькі 23 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

П. Баранаўскі.

**ЗАВЯЧЭЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВУШАЦКАГА РАЁНУ КАЛЕКТЫВІЗАВАН НА 15 ЧЭРВЕНЯ НА 95 ПРОЦ.** Пляны сяўбы па ўсіх культурах агул выкананы на 108,8 проц., а па тэхнічных культурах—на 134 проц.

Б. П.

**КАЛГАС ІМЯ «ФРУНЗЭ»** Заслаўскага раёну 4 чэрвеня поўнасьцю скончыў веснавую сяўбу. У першыя дні сяўбы на палёх калгасу было шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Калгасьнікі ўсе як адзін працавалі з вялікім захапленьнем. Зараз фрунзэўцы ўзялі на буксір саўгас «Беларусь» Гатовінскага сельсавету. Калгас старанна рыхтуецца да ўборачнай кампаніі.

Н. М.

Да пачатку веснавой пасеўкампаніі **Талачынскі сельсавет** таго-ж раёну, быў калектывізаван на 50 проц. Дзякуючы ўдарнаму правядзеньню сяўбы і ўвядзеньню зьдзельшчыны **процант калектывізацыі дасягнуў зараз 96. Пасеўны плян па ўсіх культурах не равыкананы.** Па ўдарнаму рыхтуюцца калгасы да ўборачнай кампаніі.

Любчанскі.

**Па Голацкім сельсавеце** (Сьмілавіцкі раён) у час веснавой сяўбы заўважаецца новы прыліў у калгасы. За апошнія дні ў калгас «Юны Піонэр» улілося 8 бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Дзякуючы поўнаму ўвядзеньню зьдзельшчыны, і разгортваньню сацыялістычнага соцспаборніцтва і ўдарніцтва, калгас «Юны Піонэр» у час скончыў сяўбу. Пасеўны плян выкананы поўнасьцю. Калгасьнікі прыступілі да поліва агародаў і да падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Зяняўчык.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

# У МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ КААПЭРАЦЫІ

## арганізуем ударнікаў-энтузіястаў сацыялістычнага будаўніцтва на выкананьне адозвы партыі і ўраду аб перабудове спажывецкай кааперацыі

### Рашуча зьнішчым недахопы ў работе спажывецкай кааперацыі і ператворым яе ў перадавы вучастак барацьбы за сацыялізм

## Спажывецкая кааперацыя БССР да міжнароднага дню кааперацыі

Сьнежаньскім пленумам ЦК УсеКП(б) і адозвай партыі і ўраду вельмі яскрава вызначаны палітычныя і гаспадарча-практычныя задачы спажывецкай кааперацыі.

У той час, як рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі пераможна завяршае набудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР, паказваючы ўзоры гераічнай працы, кааперацыя адстала ад усеагульных тэмпаў. «Уступіўшы ў перыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце неабходна настойліва патрабаваць ад кааперацыі кардынальнай перабудовы сваёй работы прыстасавальна да гэтага новага перыяду сацыялістычнага будаўніцтва» (З рэзал. 16 зьезду УсеКП(б).

Міжнародны дзень кааперацыі ў гэтым годзе супаў з вялікай рэарганізацыйнай работай кааперацыі. Міжнародны дзень кааперацыі у сучасных умовах зьяўляецца днём праверкі выкананьня кааперацыяй заданьняў партыі і ўраду.

Кааперацыя БССР бязумоўна мае рад дасягненьняў. За апошнія два гады колькасьць членаў кааперацыі вырасла ад 655 тыс да 1.500 тыс. Зварот за гэты-ж час вырас ад 145 млн. руб. да 323 млн. руб. Гандлёвая сетка вырасла з 2.250 адзінак—да 5.042 адзінак. Накапленьні ўласных сродкаў павялічыліся ад 16 млн. руб. да 40 млн. руб.

Палепшылася за гэты час абслугоўваньне рабочага спажыўца. Так, напрыклад, колькасьць сталовых узрасла з 64 да 220. Адпаведна павялічылася колькасьць адпускаемых абедаў: з 27 тыс. да 200 тыс.; абслугоўваньне чэканым хлебам павялічылася ад 40 проц. у 1930 годзе да 80 проц. у 1931 годзе, а ў буйных вытворчых цэнтрах да 100 проц.

У прыгарадных гаспадарках кааперацыйных аб'яднаньняў засеяна 25 тысяч га.

Пры ўсіх гэтых бясспрэчных дасягненьнях трэба, аднак, прызнаць, што спажыўкаапэрацыя не завяршыла яшчэ перабудовы сваёй работы згодна дырэктыў партыі і ўраду. Толькі нядаўна закончылася арганізацыя самастойных рэспубліканскіх галінных аб'яднаньняў па розьнічным гандлі. Яны яшчэ ня ўзмоцнены дастатковымі кадрамі кваліфікаваных работнікаў. Не ўкаранены гаспадарчы разьлік у работу і вельмі марудна адбываецца перадача і арганізацыя новых спэцыялізаваных магазынаў на галінах.

32 лесарабкопы і 12 торфарабкопаў знаходзяцца ў першапачатковай стадыі арганізацыі. Яшчэ ня выканана нават кантрольная лічба ліку торфарабкопаў (15).

А ва ўмовах БССР на гэтыя аўтаномныя сэкцыі трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Марудна ідзе рэарганізацыя сельскіх спажывецкіх кааператываў і райсельсаюзаў.

Марудна́сьць перабудовы зробіцца зусім зразумелай калі ўлічыць той факт, што на сёньняшні дзень перабудова работы кааперацыі зьяўлялася толькі справай саміх апаратаў. Рабочая маса ўцягнута ў перабудову кааперацыі вельмі мала.

Неабходна як мага хутчэй перабудаваць партыйную, камсамольскую і прафсаюзную работу ў самой сыстэме кааперацыі, арганізуючы самастойныя ячэйкі ў кожнай паасобнай гаспадарчай адзінцы. Вялізарная работа па перабудове кааперацыі павінна справаджацца камплектаваньнем новых кадраў работнікаў прылаўка.

**Па БССР нам неабходна ўкамплектаваць сетку новымі 900 работнікамі.** Трэба тэрмінова заняцца стварэньнем кароткатэрміновых курсаў і практыкі для падрыхтоўкі з ліку камсамольцаў рабочай і калгаснай моладзі здольных работнікаў. Неабходна рашуча ўкараняць гаспадарчы разьлік у кааперацыю, дабівацца ўзорнага выкананьня гандльпляну і сустрэчнага гандльпляну на аснове магутнай хвалі ударніцтва і сацспаборніцтва.

Жаданьне некаторых працаўнікоў заняцца непасрэдным пераходам да прадуктаабмену—б'е па гаспадарча-разьліковаму пачатку. З гэтым трэба навесьці рашучую барацьбу.

У сыстэме кааперацыі асаблівую ролю адыгрываюць закрытыя рабочыя разьмеркавальнікі, якія бязумоўна сябе апраўдалі. Белкаапсаюз павінен паставіць перад сабой задачу ўсямернага ўзмацненьня гэтых рабкопаў, г. зн. узмацніць гаспадарча-разьліковы пачатак, фінансавую базу сьмялей ісьці па шляху ахопу бюджэту рабочых, даць рабкопам гаспадарчую ініцыятыву (напрыклад, заключэньне дагавораў з калгасамі і г. д.).

Трэба асабліва чоткa паставіць пытаньне аб сельскай кааперацыі. У ёй яшчэ няма рашучага павароту да калгасьніка.

**Трэба зьнішчыць недахопы сельскай кааперацыі:** кумаўство, наяўнасьць «абязьлічкі» у завозе тавару. Сельсаветы, калгасы, грамадзка-палітычныя арганізацыі павінны ў парадку баявой работы заняцца перабудовай кааперацыі на вёсцы, ператварыўшы яе ў магутны падважнік калектывізацыі.

Міжнародны дзень кааперацыі ў 1931 годзе павінен зрабіцца днём пачатку больш энэргічнай перабудовы кааперацыі. Абапіраючыся на ўдарнікаў, на шырокую масавую ініцыятыву і кантроль спажыўкаапэрацыя павінна хутчэй выканаць дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове сваёй работы.

**Гарын.**

Работа на парніках.



Фасоўка тавараў у ЗРК.

## Цёплая сямейка

Ня раз пісалася пра Старасельскую спажывецкую кааперацыю. Аднак, факты нядбайства там яшчэ маюць месца. Асобныя члены рэўкамісіі замест таго, каб выкрыць усе хваравітыя бакі, даць напрамак у далейшым,—самі займаюцца злачынай дзейнасьцю.

Так, напрыклад, у былога загадчыка крамы Каласоўскага знойдзена 7 пачатых бутэлек віна. Загадчык крамы Каласоўскі і старшыня праўленьня Розэнман у краме п'янствавалі, а член рэўкамісіі Беленькая, якая мае в імі вельмі цесную сувязь, прыкрывала шмат фактаў п'янства. Яна-ж, зграваўшыся са старшынёй сельспажыўтаварыства Розэнманам, склала акт аб тым, што 7 бутэлек віна быццам папсаваны.

Рахункавод Храмцоў у канцэлярыі ніколі не працуе, мае цесную сувязь з кулаком, былым буйным лесапрамыслоўцам Аэярбахам, Храмцоў перадаў яму некаторыя прадукты з кааперацыі, якія самому Аэярбаху дастаць немагчыма.

Праўленьне сельспажыўтаварыства ня цікавіцца работай, яно стаіць у баку ад работы кааперацыі. Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб перабудове работы спажывецкай кааперацыі, відаць не абгаворана і не распрацавана.

Работніца кааперацыі Кашановіч В. дэфіцытныя тавары прадае сваякам, а частку бярэ сабе.

Самакрытыка ў сыстэме кааперацыі не разгорнута. Калі напісалі нядаўна ў газэту пра былога старшыню сельспажыўтаварыства Розэнмана, цык ён за гэта арганізаваў праследваньне паасобных селькораў.

Трэба аздаравіць праўленьне Старасельскага сельспажыўтаварыства.

Брыгада Конькай КК РСІ **Росман, Арэшкаў.**

## З лістоў рабселькораў

**У вельмі безгаспадарчым становішчы знаходзіцца інтэрнат** пры Лядзянскай ШКМ (Лядзянскі раён). Між тым, адміністрацыя школы ня прымае ніякіх захадаў, каб прывесьці памяшканьне інтэрнату ў належнае становішча. Трэба да новага навучальнага году зрабіць рамонт і ачысьціць памяшканьне інтэрнату ад бруду.

**З.**

**Расьнянская сямігодка (Расьнянскі раён) заключыла сацдагавор з Шклоўскай і Чавускай сямігодкамі.** У сацдагаворы ёсьць пункт: «кожны месяц ставіць вечары ў школе для вучняў».

Пэдагогі Расьнянскай школы сваесасабліва зразумелі гэты важны пункт: замест вечараў самадзейнасьці, увесь час практыкаваліся вечары з танцулькамі да сёмага поту. У далейшым гэту недарэчнасьць трэба зьнішчыць.

**Д-чы.**

**Некаторыя студэнты Менскага Беларускага пэдтэхнікуму і аднагадовых пэдкурсаў** сыстэматычна зрывалі работу ліквпунктаў, да якіх былі прамацаваны.

Грамадзкі суд пэдтэхнікума на гэтых зрыўшчыкаў: Шадлюка, Ананіча, Нарэйку, Паўлоўскага і Шкадарэвіча—налажыў розныя пакараньні. Студэнцтва тэхнікуму з абурэньнем асудзілі зрыўшчыкаў ліквідацыі нятысьменнасьці.

**А.—сь.**

**Настаўнік Сьмілавіцкай яўрэйскай сямігодкі Мірскі кінуў школу і працуе ў кааперацыі.**

На запытаньне—чаму ён ня ідзе працаваць у школу,—Мірскі адказвае,—у Райпо мне больш плацяць.

Трэба лятуча вярнуць працаваць у школу і накласьці на яго спагнаньне па прафсаюзнай лініі.

**Сьмілавіцкі.**

**У Чарэйскім раёне вялікі недахоп падрыхтаваных настаўнікаў.** Між тым, некаторыя настаўнікі, скончыўшыя пэдтэхнікумы, працуюць не па спэцыяльнасьці. Так, настаўнік Мясьнікоў працуе фінінспэктарам, настаўнік Шыняевіч—у райкоме партыі.

Трэба выканаць дырэктывы СНК БССР і ўсіх настаўнікаў, якія працуюць не па спэцыяльнасьці, вярнуць у школы.

**Настаўнік.**

**Настаўніцамі 9-й Менскай школы т. т. Болбат і Булгак была дапушчана грубая памылка** ў справе зьніжэньня непасыпяховасьці вучняў у групе. Замест таго, каб падняць працу гурткоў для адстаючых вучняў, яны практыкавалі заняткі на даму са сваімі-ж вучнямі.

Калектыў 9-й школы асудзіў учынак т.т. Болбат і Булгак і вынёс ім суровую вымову. Праца па зьмяншэньні другагодніцтва вучняў ні ў якім разе не павінна насіць характар платнай падрыхтоўкі сваіх-жа вучняў на даму.

**Н. П.**

Калгас «Чырвоны Маяк» Нова-Максімавіцкага сельсавету, Клічаўскага раёну, в посьпехам выканаў плян сяўбы. Зараз калгас ударна рыхтуецца да ўборачнай кампаніі і сяўбы азімыны. Да 24 чэрвеня калгас поўнасьцю скончыў ворыва папару. Усяго ўзарана 100 га, з якіх заваявана 30 га. Акрача таго, мае быць заваявана яшчэ 60 га.

Пачынаючы з 22 чэрвеня калгас прыступіў да ўборкі канюшыны. Да ўборачнай кампаніі калгас поўнасьцю падрыхтаваўся: ён мае 3 жняяркі, 2 сенакасілкі, 3 сяўнікі, 2 конных грабель.

**А. Рубашын.**

## ГАЛОДНЫЯ ПРАРЫВАЮЦЬ ПАЛІЦЭЙСКІЯ КАРДОНЫ

### Масавыя баявыя дэманстрацыі беспрацоўных у Польшчы

ВАРШАВА, 2. Бурныя дэманстрацыі беспрацоўных ня спыняюцца. Сёньнішнія газэты паведамляюць, што вялізарная колькасьць беспрацоўных у **Плоцку,** прарваўшы паліцэйскія заставы разграміла памяшканьне магістрату. Дэманстранты павыбівалі шыбы шмат у якіх крамах.

У **Быдгошчы** (Пазнанскае ваяводзтва) адбылася бурная дэманстрацыя беспрацоўных, якія супярэчылі высяленьню з кватэры за няўнос платы аднаго з беспрацоўных.

У **Лодзі** адбылася сур'ёзная сутычка паміж паліцыяй і беспрацоўнымі, звольненымі з Відзеескай мануфактуры.

**Па ўсёй тэрыторыі Дамброўскага камена-вугольнага басэйну і Горным Шлёнску** беспрацоўныя арганізоўваюць мітынгі і **галодныя буйты.** У прыватнасьці дэманстрацыі адбыліся ў **Катовіцах, Крулеўскай гуце,** у **Семявічах** і г. д.

Учынены шматлікія арышты.

### Арышты рэвалюцыйных рабочых ня спыняюцца

ВАРШАВА, 2. Арышты сярод западозраных у камуністычнай дзейнасьці **ў Варшаве працягваюцца.** Афіцыёзная «Газэта Польска» піша, што пры арыштце раду выдатных камуністычных дзеячоў знойдзена значная колькасьць камуністычнай літаратуры, размнажальныя апараты і рукапісы.

### Сотні тысяч рабочых без работы і бяз хлеба

ВАРШАВА, 2. Лік зарэгістраваных беспрацоўных на 27 чэрвеня г. г. склаў, паводле афіцыйных даных, 280,165 чал., г. зн. на 11.883 чал. менш, чым у мінулым тыдню, і на 75 тыс., г. зн. амаль на 40 проц. больш, чым у канцы чэрвеня 1930 г.

**Толькі 94.405 чал.,** г. зн. **менш адной трэцяй** усіх беспрацоўных, **атрымліваюць дапамогу.** Зварочвае на сябе ўвагу той факт, што афіцыяльная статыстыка паказвае скарачэньне беспрацоўя ў той час, калі па ўсёй краіне праходзіць новая, выключная хваля масавых звольненьняў. Пасьля закрыцьця адных толькі **Відзеескай мануфактуры і Жырардаўскай фабрыкі** страціла работу каля **10.000 рабочых і служачых.** На 1-га ліпеня страцілі работу або атрымалі папярэджаньне аб звольненьні каля **20.000 дзяржаўных служачых.**

Паводле вестак «Кур'ера Чырвонага», тры фабрыкі па вырабу электрычных лямпачак ў Варшаве, а іменна: «Тунграм», «Філіпс» і «Острам», папярэдзілі аб звольненьні ўсіх служачых у ліку звыш 1.500 чал.

На Горным Шлёнску на капальных і металюргічных заводах Пшчынскага звольнена ўчора 800 служачых і хутка прадбачыцца звольненьне яшчэ каля 200 чалавек.

### Паглыбленьне крызісу ў ПАЗШ

#### Рост беспрацоўя, галечы і паўпэрызацыі працоўных мас

НЬЮ ЁРК, 19. Ня гледзячы на аптамістычныя заявы Гувэра пасьля яго звароту з цэнтральных раёнаў. Захаду, становішча рабочых усё больш пагаршаецца. Беспрацоўе працягвае расьці і лік беспрацоўных складае ад 8 да 20 мільёнаў, ня лічачы многіх мільёнаў часткова беспрацоўных. За пас грошай у рабочых даўно скончыўся, а грамадзкая дабрачыннасьць знач на скарацілася. Зьнішчэньне зарплаты зрабілася звычайнай зьявай.

Сярод неарганізаваных рабочых ад бываецца шалёная барацьба за атрыманьне работы, якая выкарыстоўваецца прадпрыемцамі для далейшага зьніжэньня зарплаты. У цэнтральных раёнах Захаду ў часе ўборкі з палёў зарплата не перавышае той, якая існавала 30 год таму назад.

У перыяд «працьвятаньня» **ваенныя вярбовачныя** пункты амаль пуставалі, але ў сучасны момант вярбовачныя пункты **перапоўнены натоўпамі галодных маладых рабочых.** Ля кантор па найму маракоў таўпяцца тысячы беспрацоўных. Падзеньне амэрыканскага замежнага гандлю моцна адбілася на бюджэце маракоў. Часта **капітаны** рады **пайсьці на пасаду заг. суднавай гаспадаркай і галоўныя інжынэры згаджаюцца ісьці на пасаду змазчыкаў.**

Рабочы друк паведамляе, што фірма «Форд Матор Кампані» **зьменшыла** зарплату **тысячам сваіх рабочых** на доляр і больш у дзень, звольніўшы і потым зноў наняўшы гэтых рабочых за меншую плату. Буйная кампанія «Юнайтэд Стэйтс Стыл Карпарэйшэн» хоча зьменшыць зарплату сваім рабочым.

—

Выраб сталёвай прамысловасьці моцна скараціўся і ў сучасны момант складае толькі 38 проц. сваёй вытвор чай магутнасьці. Дзесяткі тысяч рабочых звольнены. Буйная чыгуначная кампанія ў Чыкаго прыступіла пасьля масавага звольненьня да агульнага зьніжэньня зарплаты. Фірма Гугенгейма, кантрактуючая большую частку здабычы і выплаўкі каляровых металяў, закрывае на ўсё лета рад плавільных заводаў і капальняў. Па чутках, мятчыма, што ўсе галоўныя мядзяныя капальні будуць закрыты, каб падтрымаць на медзь цану, якая зьяўляецца самай нізкай калі-небудзь існаваўшай у Амэрыцы.

Эканамічны крызіс цяжка адбіўся на становішчы рабочых будаўнічай прамысловасьці, якія лічыліся «арыста кратыяй» амэрыканскіх рабочых з прычыны іх параўнаўча высокай зарплаты, якая ў 3 і нават у 6 разоў перавышала зарплату чорнарабочага. Будаўнічая прамысловасьць скарацілася больш чым на палову ў параўнаньні з 1928 годам. На працягу мая 1928 году было заключана будаўнічых кантрактаў на суму 667 мільёнаў даляраў, і ў маі 1931 году на 301 міль ён даляраў.

На ўсіх дарогах тысячы беспрацоўных будаўнікоў пераходзяць з горада ў горад у дарэмнай надзеі атрымаць работу. Ня гледзячы на ўсе абяцаньні прафсаюзаў падтрымліваць патрэбны ўзровень зарплаты, апошняя моцна падрэзваецца. Як агульнае правіла прадпрыемцы плацяць на 25-30 і нават 50 проц. ніжэй устаноўленых ставак. Пратэстуючыя рабочыя звальняюцца.

### Усе Гішпанія ахоплена масавымі забастоўкамі

ПАРЫЖ, 2. Агенцтва Гавас публікуе атрыманыя з розных правінцый Гішпаніі паведамленьні аб стачачным руху. У Валенсіі працягваюць забастоўкі трамвайшчыкаў і пекароў. На гідраэлектрычнай станцыі ў мясцовасьці Меларэс, дзе адбываецца забастоўка, пачаліся хваляваньні. Падрабязнасьці невядомы. У Міларэс накіравана жандармерыя. Мэр Валенсі паведаміў, што з вычарпаньнем фондаў дапамогі беспрацоўным, грамадзкія работы будуць спынены. Не атрымліваючы платы за гэтыя работы, беспрацоўныя кінулі работу.

У Малазе працягваецца ўсеагульная стачка. Учора забаставалі друкары. Ня гледзячы на ўсе намогі ўладаў, забесьпячэньне насельніцтва прадуктамі становіцца ўсё больш цяжкім. Па ўсім горадзе патруліруюць воінскія часьці. Учора прыбыла воінская дапамога.

У Пантэвэдра забаставалі трамвайшчыкі. Усеагульная забастоўка абвешчана ў Касце. У Меліле ўчора ў поўдзень абвешчана ўсеагульная стачка. У Сэвільі стачка працягваецца з раней шай настойлівасьцю.

### Бурны рост рэвалюцыйнага лягеру — рабочыя ўступаюць у кампартыю

БЭРЛІН, 30. З усіх прамысловых цэнтраў Нямеччыны атрымліваюцца паведамленьні аб бурным росьце мясцовых камуністычных арганізацый. У Лейпцыгу на працягу аднаго дню ў кампартыю ўступіла 217 рабочых і работніц, завербавана 205 новых падпісчыкаў партыйнай газэты і 556 падпісчыкаў партыйнага штотыднёвіка. У Гасэн Франкфурце прынята ў кампартыю з 1-га мая 1900 новых членаў.

У акрузе Нюрынгіі ў партыю прынята 946 новых членаў, у тым ліку 252 рабочых ад варштату. Для ўнову арганізаванай штотыднёвай газэты на працягу аднаго месяца завербавана 8.900 падпісчыкаў.

У розных пунктах акругі створана 7 новых фабрычна-заводзкіх ячэек і 14 партыйных груп. У Макдэнбургскай акрузе на працягу 3-х тыдняў завербавана 552 новых члены партыі.

### Камуністычны даклад па радыё

БЭРЛІН, 2. Учора вечарам у Заходняй Нямеччыне быў па радыё перададены камуністычны даклад аб палітычным становішчы Нямеччыны. Улады вельмі занепакоены гэтым фактам, бо гэты даклад, бязумоўна, ня быў зроблен перад мікрафонам афіцыяльнага заходня-нямецкага радыёвяшчаньня.

Буржуазны друк думае, што даклад быў перададзены «сакрэтна» «камуністычным радыстам».

### Падрыхтоўка да вайны на поўным ходзе

ПАРЫЖ, 29. Францускі штомесячнік «Плян», зьмяшчае цікавыя даныя аб ваеннай прамысловасьці малой Антанты. Ён піша, што зараз на заводах Шкода, частка якіх знаходзіцца ў Румыніі і Польшчы, занята 40.000 рабочых, а ў часе імпэрыялістычнай вайны там працавала ўсяго 30 тысяч.

Р. Хаскін

## Некаторыя вынікі ходу перабудовы спажыўкаапэрацыі

Выключнае значэньне перабудовы работы спажыўкаапэрацыі, якая праводзіцца на падставе адозвы ЦК УсеКП(б), СНК СССР, Цэнтрасаюзу і пастаноўленьня Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР, падкрэсьлівае яшчэ раз няма ніякай неабходнасьці.

Як адозва ЦК УсеКП(б), СНК Саюза, так і рашэньне ЦК КП(б) і СНК БССР патрэбавалі ў вызначэньня тэрміны закончыць адказную і вялікую перабудову работы спажыўкаапэрацыі, накіраваную к сапраўднаму і хутчэйшаму выкараненьню буйнейшых недахопаў у рабоце спажыўкаапэрацыі і на гэтай падставе—рашучага палепшаньня абслугоўваньня спажыўца, упрашчэньня кіраўніцтва справай спажываньня спажыўца, пахутчэньня тавараазвароту, спэцыялізацыі і кіраўніцтва ўсёй гандлёвай дзейнасьцю спажыўкаапэрацыі.

Гэтыя рашэньні таксама патрабавалі ад нас выкараненьня ў рабоце сыстэмы пагардных адносін да прынцыпаў гаспадарчага разьліку і разгортваньня савецкага гандлю.

З моманту адозвы ЦК УсеКП(б), СНК Саюза і рашэньні ЦК КП(б)Б і СНК БССР прайшоў ужо такі тэрмін, які дае магчымасьць падвесьці некаторыя вынікі ходу перабудовы ўсёй работы, а тым самым падвесьці некаторыя вынікі выкананьню гэтых важнейшых рашэньняў партыі і ўраду аб работе спажыўкаапэрацыі.

1. Ці дасягнута шырока папулярызавана сярод шырокіх пралетарскіх мас значэньне важнейшага дакумэнту партыі і ўраду і ці стаў дасягненьнем кожнага рабочага, калгасьніка, батрака, бедняка і серадняка гэты дакумэнт? Трэба сказаць, што ў асноўным рашэньне партыі і ўраду аб спажыўкаапэрацыі было шырока абгаворана сярод шырокіх пралетарскіх мас, партыйных, камсамольскіх арганізацый, а таксама сярод кааперацыйнага актыву гораду і вёскі. За час з моманту выданьня гэтага рашэньня былі праведзены амаль ва ўсіх гарадах агульна-гарадзкія канфэрэнцыі кааперацыйнага актыву, работнікаў прылаўка. На рабочых і партыйных сходах таксама была шырока абгаворана значэньне рашэньня партыі і ўраду аб спажыўкаапэрацыі. Гэта бязумоўна адыграла рашаючае значэньне ў мабілізацыі ўвагі працоўных мас к пытаньням перабудовы спажыўкаапэрацыі. Гэта выклікала тую вялікую зацікаўленасьць, якая аддаецца пытаньню перабудовы кааперацыі з боку шырокіх рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас.

Аднак, тут неабходна падкрэсьліць, што і кааперацыйныя арганізацыі, і мясцовыя партыйныя, і прафсаюзныя, за апошні час аслаблі сваю увагу гэтаму пытаньню. Гэта ў сваю чаргу на чынае аслабляць увагу і шырокіх мас к самой перабудове.

2. У якім становішчы знаходзіцца сама перабудова? На сёньняшні дзень арганізацыйна-афармлены ўсе рэспубліканскія галінныя гандлёвыя аб'яднаньні і вытворчыя аб'яднаньні; аднак, трэба прызнаць, што к практычнай рабоце ня ўсе яшчэ аб'яднаньні прыступілі.

Важнейшая дырэктыва партыі і ўраду ў гэтай перабудове—перабудова работы на прынцыпах спэцыялізацыі гандлю, арганізацыі розьнічнага спэцыялізаванага гандлю, укараненьню прынцыпаў гаспадарчага разьліку,—створанымі аб'яднаньнямі яшчэ ня выканана. Намечаная к прынцыпю аб'яднаньнямі ад ЦРК спэцыялізаваная сець розьнічнага гандлю ў колькасьці каля 100 магазынаў, прынята ў невялікім процанту.

У сучасны момант пачынае ўжо разгортвацца сваю работу Плода-Гароднінае Аб'яднаньне. На сёньняшні дзень яно ўжо закончыла набудову пляна снабжэньня гароднінай у разрэзе ЦРК, ЗРК і ТПО. Спушчан плян нарыхтовак раньняй гароднінны з замацаваньнем з асобнымі рабочымі арганізацыямі. Распрацован і зацьверджан плян пераапрацоўкі гароднінны і яе хаваньня. У бліжэйшыя дні прыступаюць да адчыненьня сваёй уласнай розьнічнай сеці па гандлі плода-гароднінай у Менску—6 магазынаў, у Гомлі, Віцебску—па 2 магазыны і ў іншых гарадох па 1—2 магазыны.

Таксама пачала разгортваць сваю работу Малочна-Масьляное і Яечнае Аб'яднаньне. Ужо намечаны да адчыненьня цэлы шэраг малочна-масьляных і яечных магазынаў у гор. Менску, Віцебску, Гомлі, Барысаве.

Амаль што закончыла прыёмку спэцыялізаваная сець па розьнічнаму гандлю Галянтарэйна-Трыкатажнае Аб'яднаньне. У Менску і Віцебску ўжо пачалі працаваць спэцыялізаваныя магазы ны па розьнічным гандлі галянтарэйнай і трыкатажам. Гэта аб'яднаньне ўжо пасьпела за гэты час закупіць больш чым на 200 тысяч руб. галянтарэйна-трыкатажных тавараў зьверх плянавага завозу.

Заканчвае прынцыпае розьнічнай і спэцыялізаваный сець Мэбельна-Драўнае Аб'яднаньне. Некаторыя магазыны (Менск) ужо пачалі свой гандаль.

Значна горш абстаіць справа з астатнімі гандлёвымі аб'яднаньнямі, частка якіх яшчэ ня прыступіла амаль к прынцыпу розьнічнай сеці, а частка прыняла вельмі вызначную колькасьць.

Некалькі лепей абстаіць справа з разгортваньнем работы вытворчых аб'яднаньняў.

Аб'яднаньне па Прам. Хлебапячэньні пачынае пераходзіць на нармальныя ўмовы работы. К гэтаму часу ўсе хлебазаводы прыняты. Пабудован вытвор ча-фінансавы плян усёй хлебной прамысловасьці БССР на 3-ці квартал. Закончваецца дагаворная кампанія аб снабжэньні хлебазаводаў мукой і іншымі прадметамі неабходнымі для вытворчасьці. Таксама заканчваецца дагаворная кампанія з ЦРК, ЗРК, і ТПО на снабжэньне іх хлебам. Вырашана пытаньне, што гэта аб'яднаньне пазбіна прынцыпу у свае веданьне ад 10 да 15 проц. розьнічнай сеці па гандлі хлебам.

У адносінах аб'яднаньня па прыгарадных гасп., трэба сказаць, што тут работа разгортваецца значна марудней. Толькі зараз канчаткова ўстаноўлен сьпіс прадпрыемстваў, падлягаючых перадачы аб'яднаньню. Некаторыя з іх, напрыклад у Менску—4 гас падаркі ўжо аб'яднаньнем прыняты ў свае веданьне. У астатніх гарадох пачнецца прыёмка толькі ў бліжэйшыя дні.

Як абстаіць справа з арганізацыяй тарфяной і лясной кааперацыі, і ства рэньнем аўтаномнай сэкцыі па грамадзкім харчаваньні?—Ход перабудовы работы спажыўкаапэрацыі ў гэтых адносінах зьяўляецца таксама неадвальнаючым. Арганізацыя лесарабкопаў і торфарабкопаў прыняла надта зацяжны характар, тады, калі гэту работу трэба было правесьці максымальна на працягу 2-х тыдняў. Толькі зараз скончана работа па стварэньню ў Беларусі 32 Лесарабкопаў і 12 торфрабкопаў, частка якіх ужо прыступіла да большменш нармальнай работы. Аднак, разьдзяленьне фінансавай і гаспадарчай дзейнасьці паміж агульна-грамадзкай кааперацыяй і Торфрабкопамі яшчэ ня скончана. Самі-ж сэкцыі—Лясная і Тарфяная ня здолелі хутка пераключыцца на непасрэднае арганізацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва нізавой сецьцю. Аўтаномная сэкцыя грамадзкага харчаваньня толькі зараз прыступае да разгортваньня работы і да канчаткова га афармленьня і стварэньня аўтаномных сэкцый па ЦРК, ЗРК, ТПО і г. д.

Якія ў асноўным прычыны такому нездавальняючаму ходу, што цэлы шэраг вучасткаў работы ў гэтай перабудове яго скончаны і што самы ход перабудовы зьяўляецца нездавальняючым?

Першая і асноўная прычына—гэта аб салютна недастатковая актыўзацыя самаго апарату Белкаапсаюзу на правядзеньне ўсёй перабудовы. Недаацэнка ня поўнае разуменьне ўсёй глыбіні значэньня рашэньняў партыі і ўраду аб рашучай і карэннай перабудове ўсёй работы спажыўкаапэрацыі. Тэндэнцыі падмяніць гэту карэнную перабудову чарговай, так званай, рэарганізацыяй спажыўкаапэрацыі. А адсюль, як вынік, недаацэнка значэньня спэцыялізаванай розьнічнай сеці і ея ролі ў справе палепшаньня абслугоўваньня спажыўца, спрашчэньня кіраўніцтва гандлем, укараненьня гаспадарчага разьліку, што зтрымлівае поўнае ажыцьцяўленьне прынцыпаў савецкага гандлю.

Таму зусім невыпадкова, калі пры перадачы спэцыялізаванай сеці розьнічнага гандлю і другіх мерапрыемстваў, зьвязаных са стварэньнем галінных аб'яднаньняў і адходам ад ЦРК дэлага шэрагу галін работ,—немецічуся недапусьцімы антаганізм і супраціўленьне з боку асобных ЦРК. Гэта адносіцца да Менскага, Гомельскага і Віцебскага ЦРК, часткова да Аршанскага ЦРК; прычым, недапушчальным зьявішчам зьяўляюцца агульныя разважаньні і гутаркі, што: «У нас усё забіраюць і нічога не застаўляюць», пра водзіцца лінія на затрымку перадачы сеці, барацьба супроць перадачы асобных магазынаў і г. д.

Ёсьць і іншыя выпадкі, калі спэцыялізаваныя магазыны пачалі расфармі роўвацца, як спэцыялізаваныя і перадаваціца іншым арганізацыям. Такое ста новішча мела месца ў Бабруйску.

Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што кіруючыя работнікі ЦРК не зразумелі значэньня карэннай перабудовы спажыўкаапэрацыі, незразумелі значэньня арганізацыі спэцыялізаванага гандлю, не разумеюць, што толькі на гэтай падставе можна палепшыць абслугоўваньне спажыўца. Спрасьціць кіраўніцтва гандлёвай работай, укараніць сапраўдны гаспадарчы разьлік. Гэта лішні раз пацьвярджае, на колькі бюракратызацыя, закаруслась у асобных зьвеньнях сыстэмы глыбока засела, і наколькі сільна тэндэнцыя працаваць у вялікім маштабе «в общем и целом», не канкрэтызуючы работу, не спэцыялізуючы гандаль, не спрашчаючы кіраўніцтва.

Чым іншым можна тлумачыць тугарукі пры перадачы прыгарадных гаспадарак, плода-гароднай справы, аб тым, што калі-б мы зналі, што будзем пераходзіць у галінныя аб'яднаньні, мы-бы таго-та і таго-та не рабілі ня ўклад валі-б сродкаў і г. д., калі ня гэтымі тэндэнцыямі?

Чым іншым можна тлумачыць недапусьціма праяўленую халапнасьць з боку шэрагу ЦРК да праполачнай гаманіі, выразіўшуюся ў паслабленьні ўвагі, нежаданьні прымаць неабходныя меры, забясьпечваючы пасьпяховасьць праполачнай кампаніі, толькі таму, што асобныя гаспадаркі пераходзяць у аб'яднаньні.

Другая прычына: ня гледзячы на цэлы шэраг прынятых рашэньняў Прэзыдыумам ЦСПСБ аб максымальным удзеле і дапамозе ў перабудове праф саюзных арганізацый,—гэтай дапамогі і гэтага ўдзелу з боку як паасобных ЦП Саюзаў,, так і мясцовых прафарганізацый на сёньняшні дзень яшчэ ня ма.

ЦП Саюзу кааперацыйных работнікаў, як павінна было аказаць перабудову ве выключную дапамогу, гэту дапамогу аказала слабаведастаткова актывізавала вялізавы кааперацыйны апарат, кааперацыйных работнікаў на гэтую работу і не правяла дастатковай рашучасьці ў адносінах перасоўваньня асобных членаў прафсаюзу з другіх арганізацый у аб'яднаньні для ўзмацненьня іх работы. Таксама ня ўсе мясцовыя партыйныя арганізацыі ацанілі значэньне гэтай перабудовы і адгэтуль зусім недастатковая ўвага ўдзяляецца ходу перабудовы і дапамозе ў гэтай перабудове. Наадварот, ёсьць шэраг выпадкаў, калі ў самы пэрыяд перабудовы, калі неабходна найбольшая ўвага рабоце спажыўкаапэрацыі, узмацненьню не работнікамі—працягваецца перакідка работнікаў ў іншыя арганізацыі і недастатковае ўзьдзеяньне на мясцовыя кааперацыйныя арганізацыі, якія супраціўляюцца ў асобных выпадках ходу перабудовы.

Таксама неабходна падкрэсьліць, што друк, як рэспубліканскі, так і мясцовы, недастаткова ўдзяляе ўвагі ходу перабудовы. Ён да апошняга часу, слаба мабілізаваў увагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці вакол гэтай перабудовы.

Асноўныя вывады:

Агульныя тэмпы перабудовы ўсёй работы зьяўляюцца неадвальняючымі. Перад намі стаіць выключна адказная задача, разварнуць самыя баявыя тэмпы якія могуць забясьпечыць хутка да канца завяршыць перабудову работы спажыўкаапэрацыі.

Закончыць у бліжэйшыя дні поўны пераход да самастойнай арганізацыйна-фінансавай работы ўсіх аб'яднаньняў і перадачу ім усёй спэцыялізаванай сеці розьнічнага гандлю.

Накіраваць работу ўсіх гандлёвых аб'яднаньняў і іх розьнічнай сеці па лініі першачарговага абслугоўваньня рабочых важнейшых галін прамысловасьці.

Стварыць вакол работы галінных аб'яднаньняў па розьнічнаму гандлю шырокі рабочы кантроль; зьвязаць іх работу з работаю закрытых рабочых кааператываў, і праз іх усямерна ўзмацніць і разьвіваць работу закрытых рабочых кааператываў (ТПО, Лесрабкопу, Торфрабкопу, саўгасскіх рабкопаў і г. д.), укараніючы ва ўсю работу галінных аб'яднаньняў строгі прынцып гаспадарчага разьліку і разгортваньня савецкага гандлю, не дапушчаючы ператварэньня галінных аб'яднаньняў па розьнічным гандлі ў аптовыя арганізацыі, а максымальна разгортваючы і пашыраючы гандлёвую сець па розьнічным гандлі.

Рашучым чынам палажыць канец тэндэнцыям антаганізму і супраціўленьняў з боку асобных кааперацыйных арганізацый, весьці з гэтым барацьбу, як з праяўленьнем правага апартунізму на практыцы.

Неабходна, каб прафсаюзы значна больш разгарнулі работу па кіраўніцтве і дапамозе ходу перабудовы і самой рабоце асобных галінных аб'яднаньняў.

Таксама неабходна, каб друк значна больш удзяляў увагі ходу перабудовы і работы асобных аб'яднаньняў, шырока асьвятляючы па асобных галінах работы недахопы і скажэньня, якія маю

# Пастанова Савету Народных Камісараў Беларускай ССР

## „Пра памольны збор“

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

Плата за перамол збожжа і пераапрацоўку яго ў крупы, а таксама за пераапрацоўку семя ў алей на ўсіх млынох, мукамольна-крупяных, крупяных і маслабойных прадпрыемствах, незалежна ад іх маштабнасьці і належнасьці бярэцца ў натуральнай форме (памольны збор).

2) Памольны збор бярэцца з прывезенага для пераапрацоўкі збожжа.

3) Плата натураю за памол не бярэцца за збожжа і алейнае семя, якое пераапрацоўваецца для Саюзхлеба, Спажывецкай кааперацыі, Наркаведу, МТС для ўласных патрэб і калгасаў, для якіх захоўваюцца стаўкі і сыстэма расплаты, устаноўленыя пастановамі Эканамічнай Нарады БССР за 22 чэрвеня 1927 г. і за 18 жніўня 1927 г. і Народнага Камісарыяту Гандлю БССР за 14 верасьня 1927 г. і 5 лютага 1928 г. За перамол збожжа і пераапрацоўку алейнага семя калгасаў бярэцца памольны збор на агульных падставах, прычым прадпрыемствы калгасаў павінны браць памольны збор за пераапрацаванае збожжа і алейнае семя таксама і ад сваіх членаў.

4) Устанавіць стаўкі памольнага збору за пераапрацоўку збожжа і алейнага семя па наасобных сэктарох у наступных разьмерах:

а) Для калгасаў і іх членаў:

| Род памолу | У гарадох і мястэчках | | У сельскіх мясцовасьцях | |
|---|---|---|---|---|
| | На парав., нафт. і інш. мэх. млынох | На вядз. ветр. і інш. немэх. млын. | На парав., нафт. і інш. мэх. млынох | На вядз. ветр. і інш. немэх. млын. |
| | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. |
| Просты памол | 10,5 | 9,5 | 9,5 | 8,5 |
| Абойны памол 95 % | 15,5 | 14,0 | 14,0 | 12,5 |
| Пшанічны памол аднагатун. 85% | 22,0 | 19,5 | 19,5 | 18,0 |
| Крупы прост. 60—65% | 15,5 | 14,0 | 14,0 | 12,5 |
| Крупы гатунк. 40—50% | 20,5 | 18,5 | 18,5 | 17,0 |
| Масла ільняное | 27,5 | 27,5 | 27,5 | 27,5 |

б) Для бядняцка-серадняцкіх гаспадарак з павышэньнем на 20 проц. у параўнаньні з стаўкамі ўстаноўленымі для калгасаў, гэта значыць:

| Род памолу | У гарадох і мястэчках | | У сельскіх мясцовасьцях | |
|---|---|---|---|---|
| | На парав., нафт. і інш. мэх. млынох | На вядз. ветр. і інш. немэх. млын. | На парав., нафт. і інш. мэх. млынох | На вядз. ветр. і інш. немэх. млын. |
| | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. |
| Просты памол | 12,5 | 11,5 | 11,5 | 10,0 |
| Абойны памол 95 % | 18,5 | 10,5 | 16,5 | 15,0 |
| Пшанічны памол аднагатун. 85% | 26,5 | 23,5 | 23,5 | 21,5 |
| Крупы прост. 60—65% | 18,5 | 16,5 | 16,5 | 15,0 |
| Крупы гатунк. 40—50% | 24,5 | 22,0 | 22,0 | 20,5 |
| Масла ільняное | 33,0 | 33,0 | 33,0 | 33,0 |

в) Для кулацказаможных гаспадарак з павышэньнем на 40 проц. у параўнаньні з стаўкамі ўстаноўленымі для калгасаў, гэта значыць:

| Род памолу | У гарадох і мястэчках | | У сельскіх мясцовасьцях | |
|---|---|---|---|---|
| | На парав., нафт. і інш. мэх. млынох | На вядз. ветр. і інш. немэх. млын. | На парав., нафт. і інш. мэх. млынох | На вядз. ветр. і інш. немэх. млын. |
| | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. | з 1 цэнт. у кгр. |
| Просты памол | 14,5 | 13,5 | 13,5 | 12,0 |
| Абойны памол 95 % | 21,5 | 19.5 | 19,5 | 17,5 |
| Пшанічны памол аднагатун. 85% | 30,5 | 27,5 | 27,5 | 25,0 |
| Крупы прост. 60—65% | 21,5 | 19,5 | 19,5 | 17,5 |
| Крупы гатунк. 40—50% | 28,5 | 26,0 | 26,0 | 24,0 |
| Масла ільняное | 38,5 | 38,5 | 38,5 | 38,5 |

5) Мукамольна-крупяныя і маслабойныя прадпрыемствы, павінны здаваць увесь памольны збор адпаведным памолам і культурамі Акцыйнаму Т-ву «Саюзхлеб», а ў тых мясцох, дзе яго хлебазагатоўчага апарату няма, памольны збор здаецца прадпрыемствамі па паказаньню «Саюзхлеба».

6) Устанавіць на 1931-32 г. наступны парадак разьліку паміж «Саюзхлебам» і мукамольна-крупянымі, крупянымі і маслабойнымі прадпрыемствамі за здаваемы памольны збор (збожжа):

а) пры здачы мукамольна-крупянымі і крупянымі прадпрыемствамі памольнага збору (збожжа), Саюзхлеб аплачвае ім кошт пераапрацоўкі ўсяго збожжа за якое памольны збор спагнан. Расплата за пераапрацоўку збожжа робіцца грашыма па ўстаноўленых Народным Камісарыятам Снабжэньня БССР стаўках;

б) алейнае семя, якое сабрана ад памольнага збору здаецца маслабойнымі прадпрыемствамі Акц. Т-ву «Саюзхлеб» па ўстаноўленай дырэктыўна-загатоўчай цане.

7) Розьніца паміж дырэктыўна-загатоўчай цаной памольнага збору (збожжа) і коштам пераапрацоўкі аплачваемым Саюзхлебам млынным прадпрыемствам складае працовы фонд рэканструкцыі сельска-гаспадарчага мукамольня. Гэты фонд ствараецца пры Саюзхлебе і выдаткоўваецца паводле спэцыяльнай пастановы Эканамічнага Савету БССР.

8) Саюзхлеб па ўзгадненьню з раённымі інспэктарамі снабжэньня, выходзячы з агульных кантрольных лічбаў памольнага збору па раёне, вызначае для кожнага наасобнага млына-прадпрыемства мінімальны разьмер памольнага збору, які падлягае здачы на працягу сельска-гаспадарчага году з пазначэньнем культур і тэрмінаў здачы. Аб гэтым прадпрыемству дасылаецца спэцыяльнае паведамленьне.

9) Уласьнікі і арандатары мукамольна-крупяных і крупяных прадпрыемстваў могуць абскарджаць у раённы выканаўчы камітэт разьмер памольнага збору ў 5-ці дзённы тэрмін з дня ўручэньня ім паведамленьня. Абскарджань не ў паказаным парадку не аслабяе ўласьнікаў і арандатараў вышэй паказаных прадпрыемстваў ад абавязкаў унясэньня прылічаючагася з іх памольнага збору, калі аб прыстанаўленьні здачы памольнага збору ня было спэцыяльнай пастановы раённага выканаўчага камітэту, якому была накіравана скарга.

10) У выпадку няздачы памольнага збору ў належных разьмерах, культурах у тэрміны паказаныя ў паведамленьях Саюзхлеба, памольны збор спагнаецца натураю у бясспрэчным парадку па млынных распарадженьнях раённых камітэтаў Саюзхлеба па памольнаму збору.

11) Калі ў працэс бясспрэчнага спагнаньня з уласьнікаў і арандатараў мукамольных, мукамольна-крупяных і маслабойных прадпрыемстваў—прыватных асоб памольнага збору у наяўнасьці ня знойдзецца, то на іх накладаецца раённымі выканаўчымі камітэтамі штраф у разьмеры да 500 руб.

12) За ўсе іншыя парушэньні правіл аб памольным зборы ўласьнікамі ці арандатарамі прыватных мукамольных, мукамольна-крупяных і маслабойных прадпрыемстваў, як напрыклад: неспагнаньне памольнага збору з памольщаў; самавольнае зачыненьне прадпрыемстваў; парушэньне ўстаноўленых стаўак памольнага збору; замена харчовых культур іншымі менш каштоўнымі; адмаўленьне ад дастаўкі памольнага збору ў вызначаныя ў паведамленьях пункты і іншае, на іх накладаецца раённымі выканаўчымі камітэтамі штраф у разьмеры да 500 руб.

13) Пры паўторным парушэньні правіл уласьнікам ці арандатарам прыватнага прадпрыемства аб памольным зборы паказаных у п. п. 10 і 12 яны прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці паводле артыкула 152 Крымінальнага Кодэксу.

14) Парушэньне правіл аб памольным зборы прадпрыемствамі аграмаджанага сэктару (дзяржаўнымі, кааперацыйнымі, калгаснымі і інш.) выклікае:

а) пры парушэньні ў першы раз пэрсанальна на загадчыкаў гэтых прадпрыемстваў, ці членаў кіраўніцтва адпаведных арганізацый, якія кіруюць гэтымі прадпрыемствамі, штраф у разьмеры ад 50 да 100 руб. паводле пастановы раённага выканаўчага камітэту, прычым не зданы памольны збор спагнаецца ў бясспрэчным парадку;

б) пры паўторным парушэньні, крымінальную адказнасьць загадчыкаў прадпрыемства ці членаў кіраўніцтва адпаведных арганізацый, якія кіруюць гэтымі прадпрыемствамі.

15) З выданьнем гэтае пастановы скасаваць пастановы СНК за 14 жніўня 1929 г. і за 3 ліпеня 1930 г. «пра памольны збор» (З. З. БССР 1929 г. № 35 пастанова № 203 1930 г. і № 26, пастанова 169).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў СНК і Эк. Савету БССР **Кандыбовіч.**

29 чэрвеня 1931 г. г. Менск.

# ПА БССР

## ВЫНІК МАСАВАЙ РАБОТЫ

**(Халопеніцкі раён).**

Пасьля правядзеньня шырокай растлумачальнай работы аб новым сельска-гаспадарчым падатку і пасьляховым правядзеньні вучоту аб'ектаў абкладаньня, бядняцка-серадняцкія масы Латыгаліцкага сельсавету добра зразумелі значэньне гэтага падатку ў справе мабілізацыі сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва.

У выніку, новы сельска-гаспадарчы падатак ужо пачынае паступаць. Першым ўнёс дзьве трэціх свайго падатку член сельсавета в. Ясная Гарашавалда Паўла. Па яго прыкладу павінна пайсьці астатняя маса сялянства.

З калгасу першым унёс частку свайго падатку калгас «Чырвоная Зорка».

**К.**

## Папярэдзіць зрыў прамфінпляну

**(Віцебск).**

Работа фабрыкі «Прафінтэрн» цалкам залежыць ад раскройнага цэху фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», якая забясьпечвае «Прафінтэрн» паўфабрыкатам. Ня гледзячы на тое, што яшчэ ў маі месяцы г. г. Белшвэйаб'яднаньне прапанавала дырэкцыі фабрыкі перавесьці раскройны цэх на тры зьмены,—гэта пастанова ня выконваецца, з-за чаго фабрыка «Прафінтэрн» мае вялікія прастоі з-за недастатковага забясьпечаньня фабрыкі таварам.

Так, па віне раскройнага цэху фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» 6-га чэрвеня першая зьмена фабрыкі «Прафінтэрн» замест 650 камплектаў дала 450, другая зьмена таго-ж ліку дала 230 замест 650, дзіцячы цэх 6-га чэрвеня зусім не працаваў, між тым ён мае вялікае значэньне ў сэнсе падрых тоўкі адзеньня для школьнікаў. 7-га чэрвеня да 9½ гадз. раніцы паліто-цэх фабрыкі «Прафінтэрн» стаяў.

Мы патрабуем тэрміновага ўмяшаньня адпаведных арганізацый у справу зрыву прамфінпляну на фабрыцы «Прафінтэрн» раскройным цэхам фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі».

**Спэцкор.**

## Прыклады бальшавіцкай сяўбы

Калгас імя Карла Маркса, Дамінікаўскага сельсавету (Полаччына) скончыў поўнасьцю веснавую сяўбу на 10 дзён да тэрміну. Другі калгас імя Фрунзэ, Бачарскага сельсавету, скончыў сяўбу яшчэ 29 мая з пераўзыкананьнем пляну на 14,5 проц. Зараз у гэтых калгасах пачалася падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю. Датэрміновае скончэньне сяўбы выклікала новы прыплыў у калгасы.

**Мікола Ермаленка.**

## Заданьне перавыканалі

Заданьне па рэалізацыі пазыкі па г. Віцебску выканана на 104 проц. у суме 3.480.000 руб. Падпіска праводзіцца фарсаванымі тэмпамі.

Гарком КП(б)Б **Рэзьнікаў.**
Гарпрафсавет **Разумаў.**
Гарсавет **Каралёў.**

## 100 проц. месячнага заработку на пазыку

Настаўнікі Самахвалаўскай ШКМ падпісаліся на пазыку «З рашаючы год пяцігодкі» на 100 проц. месячнага зработку, што складае каля 2000 руб. 5 чалавек настаўнікаў абавязаліся сябе ўдарыкамі па рэалізацыі пазыкі сярод астатняга насельніцтва.

**Асьветнік.**

# Дапамагчы заводам

## ліквідаваць прарывы ў вырабу будматар'ялаў

### Пастанова Савету Народных Камісараў БССР пра забясьпечаньне выкананьня пляну прадпрыемствамі, якія вырабляюць будаўнічыя матар'ялы

Адзначаючы вельмі дрэннае становішча з выкананьнем пляну прадпрыемствамі, якія вырабляюць будматарыялы (выкананьне пляну—25—30 проц. месячнага заданьня), што пагражае капітальнаму будаўніцтву 1931 г., а таксама будаўніцтву 1932 г., Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам на працягу 5-ці дзён накіраваць на заводы сваіх раёнаў патрэбную колькасьць рабочай сілы, забясьпечыўшы ў першую чаргу Гофманскія печы.

2. Абавязаць Белкалгасцэнтр вызначыць 5.000 чалавек для работы на заводах будматар'ялаў і на працягу 3-х дзён разьвярстаць гэтую колькасьць па калгасах.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і Белкавасаюзу на працягу трох дзён накіраваць на прадпрыемствы, якія вырабляюць будматар'ялы належную колькасьць харчоў і прамтавараў. Прыроўніць усе памянёныя прадпрыемствы па рабочаму забясьпечаньню да другога сьпісу. Ускласьці адказнасьць на кіраўнікоў кааперацыі за палепшаньне грамадзкага харчаваньня на заводах. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам мець стады нагляд за работай кааперацыі на гэтых заводах.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы разам з ЦСПСБ на працягу 5-ці дзён пераглядзець расцэнкі цагельнікаў у сэнсе падцягваньня зарплаты кваліфікаваным рабочым, рашуча зьнімаючы ўраўнілаўку ў зарплаце.

5. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам, гарадзкім саветам і прасіць ЦСПСБ даць тэрміновыя паказаньні прафарганізацыям аб арганізацыі культурна-масавай і прафсаюзнай работы сярод сэзоньнікаў, прымацаваўшы да заводаў групу прафсаюзных і культработнікаў.

6. Даручыць ВСНГ і раённым выканаўчым камітэтам пераглядзець склад кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія вырабляюць будматар'ялы.

7. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам мабілізаваць грамадзкасьць на ліквідацыю прарываў, прымацаваўшы спэцыяльных прарываў для дапамогі заводам. Нарработнікаў для дапамогі заводам, Наркамрацы і яго органам аказаць ўсямернае садзейнічаньне гаспадарчым арганізацыям пры вярбоўцы рабочай сілы для цагельных заводаў.

8. Даручыць Белсампрамсаюзу поўнасьцю забясьпечыць выкананьне праграмы па будматар'ялам, намеціўшы на працягу двох дзён спэцыяльныя мерапрыемствы.

9. Прапанаваць Лесбелу, Тарпааб'яднаньню, раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам забясьпечыць прадпрыемствы апаламам.

Мэтызаб'яднаньню і Белснабу ужыць усе захады для выкананьня пастановы СНК аб забясьпечаньні прадпрыемстваў, якія вырабляюць будматар'ялы цьвікамі і будаўнічымі матар'ялами.

10. Даручыць ВСНГ праверыць прычыны частых паломак цагельных прэсаў, вырабляемых на заводзе імя Сталіна і ўжыць захады да зьніжэньня гэтага, а таксама да падрыхтоўкі адпаведных запасных частак.

11. Даручыць цэнтральнаму і мясцоваму друку пачаць шырокае асьвятленьне ходу выкананьня праграмы на прадпрыемствах будматарыялаў.

12. Абавязаць усіх кіраўнікоў прадпрыемстваў кожныя пяць дзён тэлеграфна паведамляць ВСНГ аб ходзе выкананьня праграмы

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

1 ліпеня 1931 г.
г. Менск.

## Адсутнасьць сацмэтадаў працы вядзе да прарыву

**МАГІЛЕЎ. 3-7 (БЕЛТА).** Цагельны завод № 7 зьяўляецца адным з буйнейшых заводаў Магілеву. Па прамфінпляну ён павінен выпрацаваць у год 6.450.000 штук апаленай цэглы і 1.773 тысячы сырцу. Між тым, замест баявой работы, спачатку сэзону і да гэтага часу наглядаюцца скразныя прарывы. За першы квартал плян недавыкананы на 14 проц. У красавіку месяцы патрэб на было выпрацаваць 500 тыс. штук, а выпрацавана ўсяго 89100 штук

За май месяц плян выкананы на 70 проц. і за 20 дзён чэрвеня—ўсяго на 60 проц. Яшчэ горш справа абстаіць з выпрацоўкай сырцу. За май месяц пляна заданьня ў 1.500 тыс. шт. выпрацавана ўсяго 428.200 штук, і за 20 дзён чэрвеня плян выкананы ўсяго на 38 проц.

Недапушчальна абстаіць справа на заводзе з працоўнай дысцыплінай. За адзін толькі апошні месяц па няўважлівых прычынах мелася прагулаў 524 чалавекадзён у той час, як арганізацыі завода крычаць аб невыкананьні прамфінпляну з прычыны недахопу рабочай сілы.

# Дайце лесу,—дамо будматар'ялы

Дзяржплан БССР вылучыў для прамысловасьці ВСНГБ каля 5.000 кубамэтраў піламатар'ялу, а ВСНГБ размяркоўваючы свае фонды, выдзяліў усяго 900 кубамэтраў піламатар'ялу, у той час, калі патрэбна да 4.000 кубамэтраў піламатар'ялаў і 1.000 кубамэтраў круглага лесу. Уся патрэбнасьць вылічаецца больш як у 2.000 кубамэтраў,—гэта неабходна для ўсіх заводаў, акрамя 3-х новых у Менску, Воршы і Магілеве па новых будматар'ялах.

Адначасу сілікатнаму заводу ў Воршы, які мае вялікае значэньне для будаўніцтва, бо гэты завод можа лёгка рабіць усе віды новых будматар'ялаў, які завод ў 3 квадры павінен быць пушчаны ў ход і пачаць даваць прадукцыю,—трэба даць 450 кубамэтраў, каб скончыць працы па пабудове заводу, а мы мелі магчымасьць і выдзялілі яму толькі 80 кубамэтраў.

Вапнянаму заводу ў Вархоўі, які таксама ў 3-й квадры павінен пайсьці, патрабуецца 300 кубамэтраў, а мы яму далі толькі 80 кубамэтраў і яшчэ інш. заводам, якія патрабуюць па 100 і больш кубамэтраў лесу, мы даем толькі 8—10 кубамэтраў.

Дапаможам агульнай справе. Заводы гэтыя абвешчаны ўдарнымі.

Дзяржплан, ВСНГ—дайце гэтым заводам больш лесаматар'ялу, дайце магчымасьць скончыць работы.

**Р. Кацнэльсон.**

### ПАПРАЎКА

У «Савецкай Беларусі» № 150 за 3-7—31 г. на першай старонцы ў артыкуле «Прасякнуць вядзельшчынай усю работу ў калгасах» заметка пад загалоўкам **«Норм выпрацоўкі да ўборачнай няма»** датычыць **Ляднянскага раёну,** а не Лёзьненскага, як паказана ў допісе.

* * *

У газ. «Сав. Бел.» № 148 за 30-VI-31 г. на апошняй старонцы ў пастанове калегіі НКЗ БССР **«Аб уборачнай кампаніі і пераапрацоўцы лёну і канапель»**

1) У п. 5 пасьля слоў: «загрузка ільнасаломы» прапушчана: «у мачыльні, альбо расьціл саломы».

2) У п. 13 пасьля лічбы «0,6» прапушчана слова «тон».


## АПАВЯШЧЭНЬНЕ

**ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ**

— 5-VII а 7 гадзіне увечары ў Доме Працасьветы адбудзецца агульны сход усіх асьветнікаў г. Менску:

Даклад праўленьня МЦРК.



**Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.**



**Мендзяржтэатр**

СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава

ПІКАВАЯ ДАМА музыка Чайкоўскага

Білеты ў касе тэатру з 12-2 і з 5 гадз. увеч.

**Дзяржцырк**

СЁНЬНЯ ВЯЛІКІ ДНЯЎНЫ ПАКАЗ

Пачатак а 2 гадзіне

Сёньня і штодзённа

1. ДОНВАЛЬДА—Татарская трупа
2. ЭРНАНІ—Музычныя эксцэнтрыкі
3. АЎТАМАТ-ЛЯЛЬКА—Фроэ

Пачат. а 8 г. 45 х. увечары

Льготныя білеты ў рабкасе

**„Чырвоная Зорка“**

2 праграмы 1. Вечар памылак (камэдыя) 2. Злодзей (драма ў 6 част.)

Пачатак а 7 гадз. Каса з 5 г.

**Кіно-тэатр „Культура“**

Амэрыканская камэдыя Хрызантэма

Звыш праграмы—Буксы пылаюць

Пачатак а 7 гадзіне.

**Кіно „Інтэрнацыянал“**

ВОЛЬГА ЧЭХАВА у замежным фільму

ЧАЛАВЕК АГНЮ

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз.

**Кіно „Пралетары“**

Грандыёзнае відовішча

Спартак—правадыр гладыятараў у 8 част.

Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня.

ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

(вул. 2 я Лекерта № 36)

ПАТРАБУЮЦЦА

для працы ў апараце заводакіраўніцтва і ў цэхах:

1 старшы бухгальтар. 1 бухгальтар. 2 рахункаводы.

Пажадана з вытворчым стажам. Аплата па згодзе.

1—3 З водакіраўніцтва.

НКАЗ праводзіць з 4-VII па 15-VII г. г.

РЭГІСТРАЦЫЮ

УСІХ САНІТАРНЫХ ІНСТРУКТАРОЎ,

якія ў сучасны момант не працуюць па спэцыяльнасьці з мэтай іх перакваліфікацыі і прызначэньня на пасаду сярэдняга мэдперсаналу.

Інагароднім належыць прысылаць свае дакументы ў НКАЗ для рэгістрацыі.


# ПАСТАНОВА

## Народнага Камісарыяту Працы БССР

### ад 2-га ліпеня 1931 г. № 29

### Аб перадачы на прадпрыемствы і ўстановы выплаты дапамогі па часовай непрацаздольнасьці, дадатковых відах і пэнсій інвалідам працы, працуючым па найме

У мэтах палепшаньня абслугоўваньня застрахаваных па выплаце дапамогі і пэнсіі, Наркамрацы БССР **пастанаўляе:**

1. Ускласьці на дзяржаўныя і кааперацыйныя установы і прадпрыемствы, а таксама на грамадзкія і прафэсійныя арганізацыі незалежна ад колькасьці занятых у іх рабочых і служачых разьлікі і выплату:

а) дапамогі па часовай непрацаздольнасьці (па хворасьці, калецтву, цяжарнасьці і родах, каранціну і догляду за хворымі членамі сямі);

б) дапамогі па дадатковых відах (на нараджэньне і кармленьне дзіцяці і на пахаваньне застрахаваных і членаў іх сямей);

в) пэнсіі па інваліднасьці тым інвалідам, якія працуюць у гэтых установах і прадпрыемствах, за выключэньнем пэнсіянэраў, якія атрымліваюць пэнсію за выслугу год.

**Увага:** Пры наступленьні страхавога выпадку ў застрахаванага ня ў месцы знаходжаньня прадпрыемства ці установы (напрыклад у камандыроўцы), дапамога, або пэнсія выплачваецца страхакасай па месцы знаходжаньня застрахаванага.

2. Разьлікі дапамогі часовай непрацаздольнасьці вытвараюцца самымі прадпрыемствамі і установамі або арганізацыямі па больнічных лістках на падставе існуючых правіл і інструкцый па сацстраху.

Разьлікі і афармленьне права на атрыманьне дапамогі па дадатковых відах і пэнсій па інваліднасьці вытвараюцца страхакасай або выплатным пунктам, калі гэткі маецца на прадпрыемстве.

У тых месцах, дзе страхавыя касы перайшлі на натуралізацыю дапамогі па дадатковых відах, апошнія выдаюцца адпаведным органам па указаньні страхкасы.

**Увага:** Забясьпечаньне прадпрыемстваў і ўстаноў правіламі і інструкцыямі, а таксама жывое інструктаваньне іх па пытаньнях разьлікаў і выплаты дапамогі ўскладаюцца на страхавыя касы і райстрахбюро.

3. Дапамога па часовай непрацаздольнасьці выплачваецца прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі сваім рабочым і служачым да дню выздараўленьня іх або да устанаўленьня інваліднасьці, але не далей тэрміну, у працягу якога за імі захоўваецца, згодна існуючага закону, месца працы. Пасьля спыненьня працоўных адносін з наймальнікам, выплата дапамогі пераходзіць да страхкасы.

4. Выплата дапамогі па часовай непрацаздольнасьці і пэнсіі па інваліднасьці вытвараецца прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі адначасова з выплатай зарплаты, за выключэньнем тых выпадкаў, у якіх законадаўствам прадугледжаны іншыя тэрміны выплаты (напрыклад выплата уперад ¾ дапамогі пры пасылцы застрахаваных на курортна-санаторнае лячэньне і інш.).

Выплата дапамогі па дадатковых відах [illegible] адначасова з выплатай зарплаты, а ва ўстаноўленыя законам [illegible] па сацстраху тэрміны.

5. Выплачаныя прадпрыемствамі, установамі і [illegible] сумы пэнсій і дапамогі утрымліваюцца поўнасьцю [illegible] чарговай [illegible] узносаў, незалежна ад таго, ці вытвараецца [illegible] якая [illegible] ці ў канчатковы разьлік за дадзены [illegible].

Выплата дапамогі і пэнсіі ўстановамі, якія [illegible] на дзяржбюджэце або мясцовым бюджэце, ня маюць [illegible] разьліку [illegible] сацыяльнае страхаваньне, вытвараецца за [illegible] на зарплату.

Выплачаныя дапамогі і пэнсіі пакрываюцца [illegible] указаным абежнікам НКФ, Дзяржбанку і Цэнтрасаюзу НКП СССР ад 4-I 1931 г. аб выплаце дапамогі па часовай непрацаздольнасьці дзяржбюджэтнымі прадпрыемствамі і ўстановамі.

**Увага:** У тых выпадках, калі дапамога і пэнсія выплачваюцца ўстановамі, якія знаходзяцца на дзяржаўным або мясцовым бюджэце рабочым і служачым, атрымліваючым зарплату з сродкаў, па якіх разьлікі з органамі сацстраху па страхузносах не цэнтралізаваных (напрыклад спэцсродкі, крэдыты, па дзяржбюджэце, акрамя крэдытаў па зарплаце, праходзячай па арт. 1), дыя дапамога і пэнсія выдаюцца за лік гэтых-жа сродкаў і выдадзеныя сумы ўтрымліваюцца пры чарговых узносах па сацыяльным страхаваньні.

Выдаткі ўстаноў па выдадзеных пэнсіях і дапамогах у апошні мес. бюджэтнага году павінны пакрывацца страхкасамі не пазьней апошняга дню бюджэтнага году.

6. У тых выпадках, калі сумы вызначаных дапамог перавышаюць суму страхузносаў, страхавая каса зварочае гэтую розьніцу пры атрыманьні чарговых узносаў, або па ўзгадненьні з установай, прадпрыемствам ці арганізацыяй, яна залічваецца ў лік будучых узносаў.

7. Вызначаныя сумы дапамогі і пэнсій запісваюцца ўстановай, прадпрыемствам, ці арганізацыяй у асабовы рахунак рабочага або служачага (або у разрахунковую ведамасьць).

Акрамя гэтага сумы выплачаных дапамог па часовай непрацаздольнасьці і пэнсій па інваліднасьці заносяцца таксама і ў разьліковую кніжку рабочага.

8. Установы, прадпрыемствы і арганізацыі абавязкова прадстаўляюць разьлікамі 1 і 16 кожнага месяцу незалежна ад таго аплачаны ці не гэтыя лісткі. Гэты парадак не распаўсюджваецца на тыя прадпрыемствы, на якія згодна асобнай пастановы будзе ускладзена распрацоўка лісткоў непрацаздольнасьці.

9. Дапамога і пэнсія, выплачаныя застрахаванаму ўстановай, прадпрыемствам ці арганізацыяй памылкова могуць быць утрыманы пры наступнай каса робіць на больнічным лістку адзнаку аб суме, якая павінна быць дазволенага ёю разьліку, выплаціць гэтую суму.

10. Усе скаргі застрахаваных адносна няправільных разьлікаў дапамогі і пэнсіі вырашаюцца канчаткова той страхкасай, ці райстрахбюро, якая абслугоўвае застрахаваных данага прадпрыемства, ці ўстановы.

11. Рэвізійныя камісіі страхавых кас і райстрахбюро могуць рабіць вамі, ці арганізацыямі і апошнія павінны даць ім магчымасьць карыстацца дамасьці, касавымі дакумантамі (асабовыя рахункі рабочых і служачых, ведамасьці, касавымі дакумантамі і г. д.).

Праверка правільнасьці выплаты дапамогі і пэнсій можа вытвараецца ня больш як раз год з дню аплаты лістка непрацаздольнасьці і інш. дакумантаў па інш. відах страхаваньня.

12. Усе разьлікі і выплаты на падставе гэтай пастановы вытвараюцца ўстановамі, прадпрыемствамі, ці арганізацыямі без усялякай дадатковай аплаты гэтай працы страхавымі органамі.

Нам. Наркамрацы БССР **Саламонаў.**

Узгоднена з НК РСІ і НКФ БССР.


**ЗЬБЕГЛА** 26 чэрвеня 31 г. **КАБЫЛА**

цёмна-гнедай масьці, 4-х год, стрыжаная грыва, рост сярэдні

ЗНАЙШОЎШАГА

просьба паведаміць кантору 3-буд-вуч. Белсельбуд, ст. Ратамка, Менскага раёну.

Пом. нач. вуч. **Кутузаў.**


Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе прысуду ад 14 сакавіка г. г. па арт. 196 з санкц. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. старшыні Стайнскага сельскага камітэту ўзаемдапамогі Лазараву Сямёну Васілеву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе прысуду ад 14 красавіка г. г. па арт. 196 з санкц. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену Скуратоўскага сельсавету, Круглянскага раёну, Астроўскаму Пётру Івану, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Круглянскага раёну, на падставе прысуду ад 11 чэрвеня г. г. па арт. 196 з санк. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. рахункаводу Цяцерынскага вучлеспрамгасу Шведу Міхасю Андрэеву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Горацкага раёну БССР, на падставе прысуду ад 2-4 г. г. па арт. 196—213 КК., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне б. загадчыку саўгасу Дрыбен, Дрыбенскага раёну, Шашко Данілу Іванаву.

Нарсуд Грэскага раёну, на падставе прысуду ад 30 мая г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. м. Грасе Цыкевічу П. А. за нядбайныя адносіны да ускладзеных на яго па службе абавязкаў.

Нарсуд Асіпавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 22 сакавіка г. г. па арт. 152 КЦ, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне кандуктару ст. Асіпавічы Мазінскаму Зьмітру Назараву за смаленьне сьвіной тушы і нядзымань не скуры.

## ЗГУБЛЕНЫ:

Ордэр на папраўку абутку на імя Еленскага П. Квіт. 398-п.

Мэтрычны выпіс 1910 г. нарадж. Пыжык Я. Квіт. 398-п.

Пропуск на ф-ку «Пралетарская Перамога», рабочы стаж, вайсковая картка, нумар на атрыман. абутку Шымкус В. Квіт. 398-п.

Білет саюзу нарпіт, выд. г. Новабарыс. Вашкевіч М. Квіт. 398-п.


Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.

падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Галоўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА



Рэспубліканская бібліятэка Беларусі